

БІЗНЕС З ДУШОЙ У ГОМЕЛЬСКАЙ ГЛЫБІНЦЫ

МС

КОЛЬКІ КАШТУЕ ЕЎРАВІЗА ДЛЯ БЕЛАРУСКАГА СЛІМАКА?

МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 СНЕЖНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 242 (29109)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван ЛАЎРЫНОВІЧ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці:**

*«Стала добрай традыцыяй, калі кіраўнікі ўсіх рангаў, прадстаўнікі арганізацый, бізнесу, грамадскіх аб'яднанняў, проста неабыякавыя людзі наведваюць дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, апякунскія і прыёмныя сем'і, дзіцячыя бальніцы, аказваюць ім дапамогу ў вырашэнні існуючых праблем, уручаюць дзецям падарункі. Клопатам і ўвагай павінна быць акружана кожнае дзіця. Важна стварыць атмасферу свята для дзяцей у гэтыя перадНавагоднія дні, бо Новага года і падарункаў усе яны чакаюць з нецярпеннем».*

## Дзед Мароз існуе!



**На Кастрычніцкай плошчы сталіцы, дзе ззяе рознымі колерамі галоўная ёлка краіны, раннім вечарам заўсёды шматлюдна. Тут можна не толькі падзівіцца на шыкоўную ілюмінацыю, але і сустрэць жывы сімвал Новага года. Яно і не дзіва: святы ўжо на парозе!**

Фота БелТА.

## КОРАТКА

- Ядзернае паліва завязуць на Беларускую АЭС у першым квартале 2020 года.
- **Сталядротавы цэх № 1 ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга» БМК» пераадолеў вытворчую мяжу ў 2 млн тон метызнай прадукцыі.**
- Больш за 20 кампаній, якія вырабляюць і ўсталёўваюць у Беларусі аконныя і балконныя канструкцыі, падпісалі ўчора ў Мінску мемарандум аб сумесных дзеяннях па прадухіленні выпадкаў дзіцячага траўматызму з-за выпадзення з вокнаў.
- **У Мінску павялічыцца кошт праезду ў гарадскім і прыгарадным пасажырскім транспарце на 5 і 2 капейкі адпаведна.**
- Жыхарка Маладзечна выдаткавала на лжэлекара больш за $40 тысяч.

# ЗАКОНЫ ПАВІННЫ АДПАВЯДАЦЬ ІНТАРЭСАМ ГРАМАДСТВА

*Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Н. І. КАЧАНАВАЙ на закрыцці першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання*

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!



Сёння завяршае работу першая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання. Вырашаны арганізацыйныя пытанні, выбраны старшыні пастаянных камісій, іх намеснікі. Фарміруюцца планы работы Савета Рэспублікі на 2020 год, а таксама планы работы кожнай камісіі.

5 снежня гэтага года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка на сустрэчы з членамі Савета Рэспублікі і дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дакладна акрэсліў канкрэтныя задачы для парламентарыяў. Безумоўнымі прыярытэтамі з'яўляюцца ўмацаванне незалежнасці і суверэнітэту нашай краіны, захаванне пераемнасці эканамічнага курсу, які забяспечвае ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё і рост дабрабыту людзей.

СТАР. 3

# БЫЦЬ НА ВАСТРЫІ ПАДЗЕЙ

*Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў У. П. АНДРЭЙЧАНКІ на закрыцці першай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання*

Паважаныя дэпутаты!

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання падыходзіць да завяршэння.



Нягледзячы на тое што яна была непрацяглая, мы аператыўна вырашылі ўсе арганізацыйныя пытанні, сфарміравалі рабочыя органы і цяпер павінны актыўна ўключыцца ў работу па выкананні сваіх прамых канстытуцыйных абавязкаў.

Канікул у парламента няма, і найбліжэйшыя месяцы будуць для дэпутатаў вельмі напружаныя і адказныя. Таму нам важна спланаваць сваю работу так, каб да пачатку вясенняй сесіі прыйсці з важкім багажом падрыхтаваных законапраектаў.

У ліку нашых прыярытэтаў — работа над праектамі законаў, якія неабходна прыняць у рамках рэалізацыі праграмных дакументаў краіны. Перш за ўсё гэта датычыцца пытанняў развіцця фінансавага рынку, прадпрымальніцтва, інавацыйнай дзейнасці — усяго таго, што заклікана павысіць канкурэнтаздольнасць нацыянальнай эканомікі і пазітыўную дынаміку яе росту.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X
19242>

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2020 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**

# САМІТ І ПЕРАГАВОРЫ

## Аляксандр Лукашэнка 20 снежня з рабочай камандзіроўкай наведае Санкт-Пецярбург

**У горадзе на Няве ў гэты дзень адбудуцца пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета і нефармальны саміт кіраўнікоў краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Плануецца чарговы раўнд перагавораў Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна на прадмет вырашэння пытанняў у сферы беларуска-расійскіх адносін.**

Лідары краін ЕАЭС падвядуць вынікі інтэграцыйнага ўзаемадзеяння і абмяркуюць перспектывы работы на будучы год, калі старшынства зойме Беларусь, у вузкім і пашыраным складах.

У парадку дня пытанні стратэгічных напрамкаў эканамічнай інтэграцыі, назначэнне старшыні і персанальнага складу Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі.

«Аляксандр Лукашэнка таксама прыме ўдзел у нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў СНД, у ходзе якога будзе магчымасць абмеркаваць актуальны парадак дня ў дзейнасці Садружнасці. Традыцыйна на пляцоўках самітаў чакаюцца сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з замежнымі калегамі па тэматыцы двухбаковага супрацоўніцтва», — перадае прэс-служба Прэзідэнта Беларусі.

# НІКОГА НЕ РАЗГЛЯДАЕМ У ЯКАСЦІ АГРЭСАРА

## Але павінны быць гатовы папярэдзіць любую пагрозу

**Гэта лейтматыў палітыкі Беларусі ў сферы бяспекі. Учора па выніках пасяджэння Савета бяспекі Вярхоўны галоўнакамандуючы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў новы план абароны краіны на пяць наступных гадоў і Канцэпцыю будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2030 года.**

### Інструмент недапушчэння вайны

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, галоўнай тэндэнцыяй цяперашняга моманту з'яўляецца назапашванне канфліктнага патэнцыялу ў розных рэгіёнах свету: «Не слабее супрацьстаянне паміж буйнымі сусветнымі цэнтрамі сілы: Злучанымі Штатамі Амерыкі, Еўрапейскім саюзам, Кітаем і Расіяй. Як наступства размывання архітэктуры міжнароднай бяспекі, узмацнілася гонка ўзбраенняў».

Кіраўнік дзяржавы ўказаў таксама на абвастрэнне інфармацыйнага супрацьстаяння. На тое, што па абодва бакі ад Беларусі нарошчваецца ваенная моц, а імкненне падаць Расію ў якасці асноўнай пагрозы Захаду стала дамінантай палітыкі Паўночнаатлантычнага альянсу. Па словах Прэзідэнта, на гэтай падставе ў суседніх еўрапейскіх краінах пашыраецца прысутнасць войск НАТА, расце ваенная актыўнасць. Расійская Федэрацыя таксама актыўна развівае сродкі ўзбраення, дэманструе ўзрослыя баявыя магчымасці.

Змяненні ў галіне глабальнай і рэгіянальнай бяспекі, якія адбываюцца ў нашы дні, на многія гады вызначаць не толькі адносіны паміж дзяржавамі, але і, на думку беларускага лідара, кірункі далейшага развіцця ўзброеных сіл.

«Беларусь вельмі цвёрда прытрымліваецца міралюбівай палітыкі, захоўвае статус донара бяспекі ў рэгіёне, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Пры гэтым нашымі несумненнымі прыярытэтамі застаюцца развіццё ўласнай сістэмы бяспекі, а таксама працяг ваеннага супрацоўніцтва з краінамі, сяброўскімі да нас (перш за ўсё ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў)».



Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі паўтарыў непахісныя прынцыпы беларускай палітыкі: наша армія нікому не пагражае, яна з'яўляецца інструментам недапушчэння вайны, а ў выпадку агрэсіі павінна быць здольнай не толькі яе адбіць, але і нанесці непрымальную шкоду ворагу. Асноўнае прызначэнне Узброеных Сіл Беларусі — абарона суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці краіны.

### На сусветным вопыце

Цягам года пад кіраўніцтвам Генеральнага штаба праводзілася работа па перапрацоўцы плана абароны краіны ў святле цяперашніх рэалій ваенна-палітычных і стратэгічных абставін, паведаміў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, «чатыры разы мы ўжо перабудоўвалі сваё Узброеных Сілы, перш за ўсё — армію, у сувязі з тым, якія падзеі адбываюцца на планеце ў гэтай сферы». «Мы разумеем, якія ідуць войны зараз, мы дакладна разумеем, якія могуць быць войны ў будучыні, і, сыходзячы з нашага патэнцыялу, нашых магчымасцяў, пад гэта перабудоўваем свае Узброеныя Сілы, — растлумачыў ён. — Гэта на мікраўзроўні, як кажуць эканамісты. Настаў час паглядзець і на самым высокім узроўні, што нам неабходна зрабіць, як стратэгічна спланаваць абарону нашай дзяржавы».

У новым плане абароны Беларусі асаблівая ўвага звернутая на сістэму своечасовых папераджальных мер і мер у адказ у выпадку нарастання ваеннай пагрозы для нашай дзяржавы.

Другое пытанне парадку дня пасяджэння Савета бяспекі было цесна ўзаемазвязанае з першым. Яно датычылася складу Узброеных Сіл. У праекце Канцэпцыі будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2030 года вызначана, якія сістэмы развіваць у прыярытэтным парадку і якія віды ўзбраенняў неабходна мець.

Асобна былі разгледжаны магчымасці па фінансава-эканамічным забеспячэнні патрэб Узброеных Сіл і абароны дзяржавы. «Каб утрыманне і аснашчэнне арміі былі па сілах дзяржаве і не на шкоду ваеннай бяспецы», — абазначыў сваю пазіцыю Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт папрасіў усіх удзельнікаў пасяджэння Савету бяспекі растлумачыць грамадскасці прынятыя рашэнні. «Мы нічога не павінны хаваць ні ад свайго насельніцтва, ні ад нашых суседзяў, — акцэнтаваў ён. — Павінны быць цалкам празрыстыя, транспарэнтныя, не пужаць, асабліва нашых суседзяў, наша грамадства, а расказаць ім пра сітуацыю і тыя меры, якія мы плануем і будзем рэалізоўваць у розных сітуацыях».

## Пра канцэпцыю — ад распрацоўшчыкаў

**У Канцэпцыі будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2030 года вызначаны прыярытэтныя кірункі. «Упор робіцца на захаванне існуючага складу і структуры, на іх якасным развіцці за кошт, найперш, пераўзбраення, мадэрнізацыі, тэхнічнага складніку», — растлумачыў Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Станіслаў ЗАСЬ.**

Ён паведаміў, што, згодна з канцэпцыяй, выдаткі на абарону краіны павысяцца цягам найбліжэйшых дзесяці гадоў да 1,5 % ад ВУП.

На пытанне журналіста «Звязды», адкуль, на яго думку, сыходзіць галоўная пагроза для краіны, Станіслаў Зась адказаў: «Сёння кіраўнік дзяржавы сказаў досыць канкрэтна, што самая галоўная наша пагроза хаваецца ў эканоміцы. Гэта сапраўды так».

Асаблівасць плана абароны краіны на наступныя пяць гадоў таксама ў тым, што ён па ўсіх напрамках прыземлены, дадаў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ.**

«Гэта цалкам заснаваныя на дакладных разліках і забяспечаныя фінансаваннем мерапрыемствы, — сказаў міністр. — Новая канцэпцыя будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл таксама прыземленая. Штатная колькасць Узброеных Сіл застаецца ранейшая — 65 тысяч чалавек. Самы фінансава затратны пункт канцэпцыі — мадэрнізацыя і закупка новага ўзбраення, ваеннай тэхнікі. Мы прапанавалі дадатак да дакумента, дзе канкрэтна распісана, якую тэхніку будзем закупляць цягам 10 гадоў».

**Выконваючы абавязкі начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першага намесніка міністра абароны Беларусі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** расказаў журналістам, што пры распрацоўцы новага плана абароны ўлічваўся вопыт Сірыі, Украіны, Балівіі, Венесуэлы і іншых краін, якія сутыкнуліся з пагрозай для свайго суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці.

«Мы нікога не разглядаем у якасці агрэсара, — падкрэсліў выконваючы абавязкі начальніка Генеральнага штаба. — Мы — міралюбівая краіна, у нас абаронная дактрына. Словы «чужой зямлі нам не трэба, але і сваёй ні пядзі не аддадзім» — гэта пра нас».

На пытанне журналіста «Звязды», у чым асаблівасць сучасных гарачых кропак у свеце, Аляксандр Вальфовіч адказаў, што цяпер усё пачынаецца з расхіствання абстаноўкі ў краіне, дзеяння дробных груп, дыверсійна-разведвальных груп.

«Цяпер вельмі шырока выкарыстоўваюцца наёмнікі прыватных ваенных кампаній, якія спрабуюць праверыць на трываласць увесь сілавы складнік — не толькі Узброеныя Сілы. Пасля гэтага спрабуюць правесці так званую спецыяльную аперацыю, дзе спачатку адбываецца пачатковы этап, потым больш актыўны. Падключаюцца незаконныя ўзброеныя фарміраванні. У процівагу гэтаму ў нас распрацаваны комплекс мер, каб не дапусціць развязвання ўзброенага канфлікту ў Беларусі», — заявіў выконваючы абавязкі начальніка Генеральнага штаба.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Парламенцкі дзённік

# ПЕРШАЯ СЕСІЯ ЗДАДЗЕНА

## Палата прадстаўнікоў вызначылася са складам пастаянных камісій

**Учора на закрыцці сесіі кожная з іх адпаведна з пададзенымі заявамі скамплектавала склад, а пасля на першых пасяджэннях вызначыла намеснікаў старшынь камісій.**

Колькасць дэпутатаў у камісіях — ад 5 да 10. Самыя вялікія камісіі (па 10 членаў) па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы і па міжнародных справах. Па дзевяць дэпутатаў у Пастаянных камісіях па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы; па адукацыі, культуры і навуцы; па працы і сацыяльных пытаннях; па заканадаўстве; па нацыянальнай бяспецы. Дарэчы, у апошняй працуе і жанчына — Марына Лянчэўская. Менш за ўсё парламентарыяў будуць весці сельскагаспадарчы сектар. Камісія па аграрнай палітыцы на чале з Мікалаем Шаўчуком сфарміравана ў складзе пяці чалавек. Па шэсць дэпутатаў у камісіях па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі; па эканамічнай палітыцы; па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве. На аднаго члена больш у камандах Ігара Камароўскага (адказны па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі) і Людмілы Ніжэвіч (вырашаюць пытанні бюджэту і фінансаў).

### У тэму

**Людміла КАНАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях:**

«Планы сур'ёзныя, грандыёзныя. Зараз ужо ў нашай камісіі знаходзіцца праект закона аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі. Гэта самае першае, над чым мы будзем працаваць. Ёсць дэпутацкая ініцыятыва аб распрацоўцы і ўнясенні змяненняў і карэкціровак у заканадаўства аб занятасці. Таксама важны аспект у нашай рабоце. І канешне ж, заканадаўства аб ветэранах. Я думаю, мы таксама над ім папрацуем».

**Марыя ДАДАЛКА.**

# НАПЕРАДЗЕ ВАЖНЫЯ СПРАВЫ

**Учора завяршыла работу першая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання. Парадак дня быў даволі насычаны ў арганізацыйным плане. На апошнім пасяджэнні сенатары зацвердзілі намеснікаў старшынь пастаянных камісій Савета Рэспублікі.**

У час зацвярджэння складу Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі спікер верхняй палаты парламента Наталля Качанава адзначыла, што сёння надзвычай важна акцэнтаваць работу дэпутатаў Саветаў усіх узроўняў, а іх у краіне 18 100, на вырашэнні злабадзённых задач і праблем. Бо дэпутацкі корпус — гэта сур'ёзная сіла. У сваю чаргу членам Савета Рэспублікі давядзецца больш актыўна ўзаемадзейнічаць з органамі мясцовай улады.

Пачатак дзейнасці Савета Рэспублікі сёмага склікання быў азнаменаваны важнымі міжнароднымі перагаворамі на азіяцкім напрамку. Наталля Качанава сустрэлася з парламенцкай дэлегацыяй В'етнама, абмеркавала з паслом КНР у Беларусі ход далейшага развіцця двухбаковых адносін, у прыватнасці, міжпарламенцкіх сувязяў. Працягам гэтай работы можна лічыць вырашэнне пытання аб прадстаўніцтве членаў Савета Рэспублікі ў Нацыянальнай групе нашай краіны ў Міжпарламенцкім саюзе. Па словах дакладчыка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея Рачкова, Міжпарламенцкі саюз з'яўляецца ўплывовай сусветнай арганізацыяй парламентаў суверэнных дзяржаў. Сёння ў саюз уваходзяць парламенты 179 дзяржаў.

Выбарамі намеснікаў старшынь пастаянных камісій і вырашэннем шэрагу іншых арганізацыйных пытанняў фактычна завяршылася фарміраванне структуры Савета Рэспублікі. Наперадзе важныя справы.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ЗАКОНЫ ПАВІННЫ АДПАВЯДАЦЬ ІНТАРЭСАМ ГРАМАДСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Галоўнае патрабаванне Прэзідэнта — законы, якія прымаюцца, і папраўкі ў іх павінны адпавядаць інтарэсам грамадства, улічваць рэальныя патрэбы нашых грамадзян, працаваць на рашэнне канкрэтных задач і на перспектыву. Першачарговымі з'яўляюцца пытанні занятасці, павышэння прадукцыйнасці працы за кошт развіцця дзелавой ініцыятывы, паляпшэння інвестыцыйнага клімату, дыверсіфікацыі экспарту, дэмаграфія, маладзёжная палітыка.

Работа ў рэгіёнах — адзін з найважнейшых прыярытэтаў дзейнасці Савета Рэспублікі як палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Гэтай рабоце неабходна надаць новы імпульс. Высокае званне сенатара павінна пацвярджацца канкрэтнымі справамі. Членам Савета Рэспублікі варта часцей сустракацца з людзьмі, быць не толькі праваднікамі дзяржаўнай палітыкі на месцах, але і браць на сябе адказнасць за вырашэнне тых праблем, з якімі да вас звяртаюцца. Жывыя зносіны заўсёды дакладней любых справаздач і дакладаў. Таму ўсе заўвагі, прапановы, ініцыятывы, якія паступаюць падчас асабістых прыёмаў грамадзян, прамых тэлефонных ліній, сустрэч у працоўных калектывах, не павінны заставацца па-за ўвагай, а найбольш вострыя праблемы варта браць на асабісты кантроль. Пры гэтым важна ўзаемадзейнічаць з урадам, іншымі дзяржорганамі, мясцовымі органамі ўлады. Больш актыўна варта падключаць да вырашэння лакальных праблем мясцовыя Саветы дэпутатаў. Пакуль іх патэнцыял задзейнічаны не ў поўнай меры.

Хачу нагадаць: парламентарыі — людзі публічныя. Вас павінны чуць, разумець, чым вы займаецеся, якія задачы перад сабой ставіце. Усё гэта фарміруе давер да ўлады. Таму прашу кожнага члена Савета Рэспублікі актыўна працаваць са сродкамі масавай інфармацыі, інфармаваць аб сваёй дзейнасці і грамадзянскай пазіцыі праз сацыяльныя сеткі.

Паважаныя калегі!

У міжсесійны перыяд дзейнасць пастаянных камісій Савета Рэспублікі павінна быць не менш актыўнай, чым падчас сесій. Наперадзе ў нас — сур'ёзная работа па далейшым удасканаленні нацыянальнага заканадаўства, падрыхтоўцы законапраектаў, накіраваных на рэалізацыю Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на гэтую пяцігодку, а таксама стварэнне неабходнага зачыну на наступны перыяд.

Праектам плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2020 год прадугледжана распрацоўка шэрагу новых для краіны законаў: «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», «Аб самарэгуляваных арганізацыях», «Аб ліцэнзаванні», «Аб валанцёрскай дзейнасці». Актуальнай застаецца падрыхтоўка закона «Аб дзяржаўных арганізацыях і гаспадарчых таварыствах з удзелам дзяржавы».

Асаблівую ўвагу варта аддаць законапраектам, накіраваным на вырашэнне сацыяльных, дэмаграфічных, экалагічных праблем. Адпаведныя задачы пастаўлены кіраўніком дзяржавы. Сям'я павінна быць арыенцірам усёй сацыяльна-эканамічнай палітыкі, а работа з моладдзю — стаць больш змястоўнай і эфектыўнай.

Мы павінны больш актыўна прыцягваць да сваёй работы моладзь, бо гэта — важны кадравы рэсурс, наша будучыня. У сувязі з гэтым трэба паскорыць фарміраванне Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Ён павінен аб'ядноўваць найбольш актыўную і таленавітую моладзь, якая зацікаўлена ўдзельнічаць у грамадскім жыцці краіны, быць карыснай грамадству. Сёння ў Беларусі працуе больш за 40 маладзёжных парламенцкіх структур — абласных, раённых і гарадскіх. Важна, каб іх дзейнасць была эфектыўнай, каб уся моладзь бачыла работу гэтых структур.

Нам трэба будзе прадоўжыць работу па павышэнні якасці нарматворчасці. Ініцыятывы і прапановы папярэдняга, шостага, склікання Савета Рэспублікі ўлічаны пры падрыхтоўцы Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах», які ўступіў у сілу з 1 лютага 2019 года. З яго прыняццем пачаў дзейнічаць інстытут прагназавання наступстваў прыняцця законаў, уключаючы ацэнку іх рэгуляцыйнага ўздзеяння на ўмовы ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці. Уведзены пакетны прынцып падрыхтоўкі праектаў нарматыўных прававых актаў і ўдасканалены парадак іх публічнага абмеркавання. Вызначана працэдура правядзення прававога маніторынгу. Усе магчымасці прынятых мер павінны быць выкарыстаны ў нашай рабоце.

Мяркую, варта прадоўжыць практыку адкрытага абмеркавання заканадаўчых ініцыятыў з прыцягненнем прадстаўнікоў дзяржорганаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, экспертаў, навукоўцаў у фармаце пашыраных пасяджэнняў пастаянных камісій, круглых сталоў, навукова-практычных канферэнцый. І калі яшчэ ўзнікнуць нейкія прапановы па формах і метадах нашай работы, не прадугледжаных рэгламентам, мы іх разгледзім, каб наша дзейнасць была больш эфектыўнай і больш заўважнай. Пра гэта гаварыў Прэзідэнт, пра гэта кажу я. Гэта нам пад сілу, мы гэта можам. Наша работа павінна быць бачная і накіравана на карысць нашага народа і нашай краіны.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Важная складальная нашай дзейнасці — міжнароднае супрацоўніцтва. Саветам Рэспублікі напрацавана шырокая база кантактаў з замежнымі калегамі. Нельга дапусціць, каб гэтыя сувязі саслаблі або перапыніліся. Нашы міжнародныя парламенцкія сустрэчы павінны быць выніковымі: накіраванымі на павелічэнне тавараабароту з замежнымі краінамі, пашырэнне беларускага экспарту, рэалізацыю новых інвестыцыйных праектаў. Асаблівую ўвагу варта аддаць супрацоўніцтву з партнёрамі па Саюзнай дзяржаве, Еўразійскаму эканамічнаму саюзу, СНД.

Ключавым міжнародным мерапрыемствам, якое Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праводзіць сумесна з Саветам Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі, з'яўляецца Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Чарговы форум, сёмы па ліку, прыме Беларусь. Неабходна правесці яго на высокім узроўні.

Сёлета мы адзначаем 20-годдзе Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. У дыялогу з расійскім бокам Рэспубліка Беларусь нацэлена на канструктыўнае ўзаемадзеянне і, галоўнае, — на раўнапраўнай аснове. На гэтым пастаянна акцэнтуе ўвагу Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Як вам вядома, запланаваны перагаворы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі. Пазіцыя беларускага боку застаецца нязменнай: развіццё інтэграцыі павінна ажыццяўляцца з улікам нацыянальных інтарэсаў і строга на аснове прынцыпаў, закладзеных у Дагаворы. Галоўнае — гэта роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання, роўны доступ да рынкаў без выключэнняў і абмежаванняў.

Старшынства Беларусі ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза ў 2020 годзе будзе накіравана на рэалізацыю чатырох асноўных свабод аб'яднання: перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы.

Паважаныя калегі!

Папярэднім, шостым, скліканнем Савета Рэспублікі назапашана значны вопыт заканатворчай, рэгіянальнай, міжнароднай дзейнасці. Мы павінны эфектыўна выкарыстоўваць яго ў сваёй рабоце, захаваць пераемнасць, прымножыць тое найлепшае, што было зроблена нашымі калегамі.

Віншую вас з надыходзячым Новым годам і Калядамі. Жадаю ўсім здароўя, шчасця, дабрабыту. Жадаю, каб у вашай рабоце быў вынік.

Дзякуй за ўвагу!

# БЫЦЬ НА ВАСТРЫІ ПАДЗЕЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хачу звярнуць вашу ўвагу на тое, што вясной пачынаецца распрацоўка пакета бюджэтных законапраектаў. Гэта пытанне трэба трымаць на кантролі. Дэпутаты павінны ўвайсці ў склад міжведамасных рабочых груп, каб мець магчымасць своечасова рэагаваць на працэс фарміравання бюджэтна-падатковай палітыкі і захаваць сацыяльную накіраванасць бюджэту.

Самы актыўны ўдзел нам таксама трэба будзе прыняць ва ўдасканальванні заканадаўства ў сферы адміністрацыйнай адказнасці. Гэта задача пастаўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

На выкананне гэтай маштабнай работы адведзена ўсяго паўгода. У склад рэспубліканскай экспертнай групы, якая ствараецца для рэалізацыі гэтай задачы, увойдуць і некалькі нашых калег. Але трэба, каб да гэтай работы падключыліся ўсе дэпутаты, кожны па сваім профілі.

Заканадаўства аб адміністрацыйнай адказнасці ахоплівае практычна ўсе сферы жыцця грамадства. Таму, працуючы ў выбарчых акругах, мы павінны зрабіць асаблівы акцэнт на вывучэнні гэтай праблематыкі. Мяркую, і кіраўніцтву мясцовых органаў улады, і працоўным калектывам, ды і кожнаму грамадзяніну ёсць што сказаць з гэтай нагоды.

Уся атрыманая інфармацыя пры кардынуючай ролі Пастаяннай камісіі па заканадаўстве павінна быць дэталёва прааналізавана ў пастаянных камісіях з тым, каб пазіцыя нашых грамадзян была пачутая і максімальна адлюстраваная ў нормах абноўленых кодэксаў.

Задача гэта няпростая. Але мы павінны паслядоўна прасоўвацца ў дасягненні балансу інтарэсаў асобы, дзяржавы і грамадства.

У наступным годзе нам трэба будзе прыняць удзел у распрацоўцы сацыяльна-эканамічнай стратэгіі краіны на чарговае пяцігоддзе. Вялікую ролю ў гэтай рабоце адыгрывае ўмела рэалізаваная прагнастычная функцыя. Нам трэба не проста бачыць перспектывы, але і скрупулёзна пралічваць наступствы меркаваных рашэнняў.

Гэта адзін з найважнейшых крытэрыяў якасці законаў, якія прымаюцца. Таму адразу пасля зацвярджэння кіраўніком дзяржавы плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2020 год нам трэба арганізаваць дакладнае суправаджэнне ўключаных у яго дакументаў з пачатковай стадыі іх падрыхтоўкі і да ўнясення ў Палату прадстаўнікоў.

Пры гэтым неабходна пастаянна суаднасіць прапановы міністэрстваў і ведамстваў з дынамікай працэсаў, што адбываюцца ў краіне. Тут важна задзейнічаць усе формы вывучэння правапрымяняльнай практыкі — парламенцкія слуханні, пашыраныя і выязныя пасяджэнні, круглыя сталы, грамадскія абмеркаванні.

У выніку мы павінны выходзіць на канкрэтныя прававыя ініцыятывы, якія задзейнічаюць раскрыццё галоўнай канкурэнтнай перавагі краіны — дзелавога і інтэлектуальнага патэнцыялу нацыі.

Дастаткова напружаную работу нам прыйдзецца правесці і ў рамках рэалізацыі парламенцкай праграмы міжнароднай дзейнасці.

Новая яе старонка пачалася з візіту в'етнамскай дэлегацыі на чале са старшынёй Нацыянальнага сходу Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам. Акрамя таго, адбыліся сустрэчы з пасламі Турцыі і Эфіопіі.

Нашы замежныя калегі жыва цікавяцца ходам фарміравання парламенцкіх груп дружбы. І, каб падтрымаць пазітыўную дынаміку двухбаковых сувязяў, нам варта фарсіраваць гэту работу.

У мінулым скліканні было 78 такіх груп і тры міжпарламенцкія камісіі. Іх склад фарміруецца сумесна з Саветам Рэспублікі. Таму Пастаяннай камісіі па міжнародных справах неабходна забяспечыць дакладную каардынацыю гэтага працэсу.

У лютым наступнага года ў сталіцы Аўстрыі пройдзе чарговае зімовае пасяджэнне Парламенцкай асамблеі АБСЕ, дзе нашым парламентарыям неабходна заявіць аб сабе, пазнаёміцца з замежнымі калегамі і прагнуць ініцыятыўную работу, не зніжаючы тэмпаў, набраных у мінулыя гады.

Неабходна актывізаваць наша супрацоўніцтва з Міжпарламенцкім саюзам, Парлацінам і Міжпарламенцкай асамблеяй АСЕАН. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць развіццю дыялогу з Панафрыканскім парламентам і Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Усе гэтыя пытанні павінны знайсці сваё адлюстраванне ў Плане міжнароднага парламенцкага супрацоўніцтва на 2020 год. Яго падрыхтоўка стане прыярытэтнай задачай для Пастаяннай камісіі па міжнародных справах. Да канца студзеня гэту работу неабходна завяршыць.

Яшчэ раз хачу звярнуць вашу ўвагу, паважаныя калегі, што парламенцкая дыпламатыя служыць не толькі развіццю палітычных кантактаў. Кіраўнік дзяржавы нацэльвае нас на максімальнае садзейнічанне развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, дыверсіфікацыі рынкаў збыту беларускай прадукцыі, нарошчванню інвестыцыйных і кааперацыйных сувязяў.

Паважаныя калегі!

Мяркую, дэпутаты, выбраныя ўпершыню, ужо змаглі прыкмеціць, наколькі затрабаваная, складаная і шматпланавая работа, якую мы праводзім у выбарчых акругах.

Але ў канчатковым выніку ўсе яе грані сыходзяцца на прынцыпе сацыяльнай справядлівасці. І другарадных пытанняў тут няма. Бо менавіта па тым, як вырашаюцца радавыя праблемы грамадзян, людзі ацэньваюць эфектыўнасць улады.

Неўзабаве пройдуць сесіі рэгіянальных Саветаў дэпутатаў, дзе будуць разгледжаны прагнозы сацыяльна-эканамічнага развіцця і праекты абласных бюджэтаў на наступны год. І голас дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў тут павінен быць выразна чутны.

Парламентарыі заўсёды павінны знаходзіцца на вастрыі падзей, аператыўна адгукацца на ўсе інфармацыйныя выклікі і самым актыўным чынам фарміраваць навіны парадак дня з улікам максімальнага забеспячэння правоў і законных інтарэсаў сваіх выбаршчыкаў.

Ад нашай прынцыповай пазіцыі, умення працаваць з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, весці дыялог з грамадствам па самых злабадзённых пытаннях у многім залежыць давер народа да ўлады.

У найбліжэйшы час нам, безумоўна, трэба ўзяць самы актыўны ўдзел у рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці». Яе мэта заключаецца ў тым, каб ні адно дзіця, абдзеленае лёсам, не засталося ў гэтыя навагоднія дні без увагі і клопату.

Неабходна наведаць інтэрнаты, дзіцячыя дамы, бальніцы, наведаць апякунскія і прыёмныя сем'і, аказаць ім дапамогу ў вырашэнні існуючых праблем і, вядома, падарыць дзецям свята і добры настрой.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце падзякаваць вам за праведзеную работу і павіншаваць усіх прысутных у гэтай зале з надыходзячымі Раством Хрыстовым і Новым годам.

Няхай Новы год напоўніць вашы дамы сямейнай утульнасцю і цяплом сяброўскіх зносін, адкрые новыя гарызонты ў рэалізацыі ўсіх вашых прафесійных і асабістых планаў.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і поспехаў у працы на карысць роднай Беларусі.

Нашы дзеці

# ЦУД ДЛЯ КОЖНАГА ДЗІЦЯЦІ

## У нашых сілах дапамагчы жаданням спраўдзіцца

**Да дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», ініцыяванай шмат гадоў таму кіраўніком дзяржавы, за гэты час далучыліся рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, шматлікія прадпрыемствы, арганізацыі і грамадскія аб'яднанні.**


Фота БелТА.

Аб геаграфіі і казаць няма чаго — пра акцыю ўжо добра ведаюць ва ўсіх рэгіёнах краіны. Чарговае падзярджэнне таму — учарашняе наведванне Бяльніцкай дапаможнай школы-інтэрната **намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэем КУНЦЭВІЧАМ.**

«У пераднавагоднія дні важна дзяліцца дабром з тымі, хто ў гэтым мае патрэбу ў першую чаргу. Агульная задача дарослых — акружыць дзяцей клопатам і ўвагай, каб кожнае дзіця адчула радасць навагодняга свята. Мы ўсе марым пра цуды ў Новы год, а дзеці асабліва. І ў нашых з вамі сілах дапамагчы дзіцячым жаданням спраўдзіцца», — цытуе БелТА словы Андрэя Кунцэвіча.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта дадаў, што Магілёўшчына — яго малая радзіма. Таму наведванне Бяльніцкай дапаможнай школы-інтэрната перад Новым годам для яго свята ўдвая.

Андрэй Кунцэвіч і іншыя госці падарылі школе-інтэрнату неабходную бытавую і камп'ютарную тэхніку, кнігі для бібліятэкі, прысмакі. Выхаванцы інтэрната ў сваю чаргу падрыхтавалі для гасцей цікавую навагоднюю праграму: карагоды, песні, танцы і спектакль па матывах «Папялушкі». Хлопчыкі і дзяўчаты разам з педагогамі не толькі развучвалі песні і танцы, але і сшылі касцюмы, падрыхтавалі для гасцей падарункі ручной работы.

У Бяльніцкай школе-інтэрнаце вучацца дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з усёй Магілёўскай вобласці: ад дашкалят і да 16 гадоў, усяго 85 хлопчыкаў і дзяўчынак, сярод якіх 68 сірот і 43 інваліды. Выхаванцам у тым ліку прывіваюць навыкі самастойнага жыцця, дапамагаюць адаптавацца ў сучасным грамадстве.

# Новы год — у новых кватэрах

## сустрэнуць медыкі Міншчыны

**Выдатны падарунак да Новага года атрымалі медыцынскія работнікі Мінскай вобласці і Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Васямнаццатага снежня адбылося ўрачыстае адкрыццё трох інтэрнатаў для медработнікаў у пасёлку Лескаўка Мінскага раёна.**

Інтэрнаты пабудаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы. У канцы кастрычніка Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў будаўнічыя аб'екты. Ён адзначыў, што «неабходна будаваць інтэрнаты для ўрачоў, медыцынскіх сясцёр, для тых, хто працуе ў бальніцах. Гэта будзе вельмі моцна прывязваць чалавека да гэтай клінікі, да гэтага цэнтра, да гэтай зямлі».

У новых дамах адзначаць наваселлі 348 сем'яў. На іх выбар — аднапакаёвыя і двухпакаёвыя кватэры. Прасторныя, з унутранай апрацоўкай, асабістымі кухняй і санвузлом.

На першым паверсе кожнага асобнага будынка знаходзяцца абсталяваныя мэбляй адміністрацыйныя, вучэбныя памяшканні, пакоі адпачынку, дзіцячы гульнявы пакой.

З уводам у эксплуатацыю гэтых інтэрнатаў чарга сярод медыкаў Мінскай вобласці, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, скароціцца на 40 працэнтаў.

Падзяліць радасную падзею з навасёламі прыехалі намеснік старшыні Мінаблвыканкама Іван Маркевіч і начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама Наталля Баярская.

— Жыллё — гэта галоўнае. Інтэрнаты, якія адкрыліся сёння, прыраўнаваны да кватэр. Работнікі іх заслугоўваюць. Калі мы будзем максімальна ўводзіць у эксплуатацыю жыллё і забяспечым ім нашых спецыялістаў, то замацаванне па месцы работы ўзрасце да 100 працэнтаў, — адзначыў Іван Маркевіч.

Ён падзякаваў праекціроўшчыкам, а таксама будаўнікам, якія ўзвялі гэтыя будынкі. Яны праявілі высокі прафесіяналізм. Дзякуючы іх стараннам інтэрнаты вылучаюцца шырокай функцыянальнасцю і ўтульнай атмасферай. Узвядзенне такіх аб'ектаў — адна з істотных задач, якую ставіць перад сабой кіраўніцтва Міншчыны. У далейшым гэтая работа будзе працягнута.

Наталля Баярская лічыць, што такія жыллёвыя комплексы сапраўды дазволяць не толькі забяспечыць жыллём медыкаў, але і прыцягнуць новых спецыялістаў. На 2020 год запланавана рэканструкцыя некалькіх старых інтэрнатаў. У Барысаўскім раёне мяркуецца будаўніцтва жыллёвага кааператыва на 107 кватэр, а для супрацоўнікаў Мінскай абласной клінічнай бальніцы — на 250.

За апошнія гады ў Мінскай вобласці значна павялічылася колькасць маладых спецыялістаў — медыцынскіх работнікаў, забяспечаных жыллём. Пытанні вырашаюцца ва ўсіх раёнах: уводзяцца ў дзеянне інтэрнаты, выдзяляюцца арэндныя кватэры, будуюцца дамы.

2019 год для сферы аховы здароўя запомніцца адкрыццём тэрапеўтычнага корпуса ў Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы, інтэрната для супрацоўнікаў дзіцячай абласной бальніцы, рэканструкцыяй хірургічнага корпуса ў Стоўбцах і санаторыя «Кааператар» пад інтэрнат для медработнікаў у Астрашыцкім Гарадку.

Важна і тое, што ў цэнтральным рэгіёне будзе працягнута ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя. Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову Мінаблвыканкама аб дадатковым фінансаванні сістэмы аховы здароўя ў памеры 20 мільёнаў рублёў. Гэтыя сродкі будуць накіраваны на закупку сучаснага высокатэхналагічнага абсталявання.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Блізкая ўлада

# Размовы з толкам

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў суботу, 21 снежня, у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# ПАКУЛЬ БЕЗ СНЕГУ НАОГУЛ

**Другая палова снежня сёлета пачалася з анамальнага цяпла, калі ўмовы надвор'я хутчэй нагадваюць раннюю вясну. У заходніх рэгіёнах на ўсё моц зелянее каранёвая сезонная пятрушка, пачынае «прачынацца» зімовы часнок...**


Фота БелТА.

Самым цёплым днём на гэтым тыдні стала серада, калі практычна на ўсёй тэрыторыі краіны былі абноўлены тэмпературныя рэкорды дня. І віной таму атлантычныя цыклоны, якія, рухаючыся па поўначы Еўропы, працягваюць пастаўляць вельмі цёплае і вільготнае паветра. У найбліжэйшыя дні захаваецца цёплае надвор'е, але ў нядзелю атмасферныя франты прынясуць дажджы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Заўтра ўдзень мы адчуем уплыў цёплых няўстойлівых паветраных мас, якія паступаюць да нас з поўдня Еўропы. Месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. У асобных раёнах будзе слабы туман, уначы і раніцай па паўночным усходзе слабы галалёд. Тэмпература паветра днём будзе ад плюс 2 градусаў да 8 цяпла, на паўднёвым захадзе краіны прыгрэе да плюс 10.

У нядзелю чакаецца менш камфортнае надвор'е. Але гэта звязана з ападкамі, а не з цяплом. Раніцай 22 снежня на надвор'е ў краіне будзе ўплываць атмасферны фронт, які перамяшчаецца да нас з паўднёвага захаду Еўропы. На большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад нуля да плюс 7 градусаў, удзень ад плюс 3 градусаў да 10 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Дональду Трампу абвешчаны імпічмент



Дональд Трамп стаў трэцім прэзідэнтам у гісторыі ЗША пасля Эндру Джонсана (1868) і Біла Клінтана (1998), якому быў абвешчаны імпічмент палатай прадстаўнікоў Кангрэса. Рашэнне аб тым, ці працягне Трамп выконваць свае абавязкі, цяпер павінен будзе прыняць Сенат — ужо ў студзені 2020 года. У Кангрэсе прайшло два галасаванні — па кожным з двух прадстаўленых артыкулаў абвінавачвання. Артыкул пра злоўжыванні ўладай набраў 230 галасоў кангрэсменаў за імпічмент і 197 галасоў супраць. Артыкул аб перашкодзе работы кангрэса — 229 галасоў за імпічмент і 198 супраць. Для абвяшчэння імпічменту было дастаткова набраць 216 галасоў па любым з двух артыкулаў абвінавачвання. Напярэдадні галасавання ў палаце прадстаўнікоў дэмакраты далі зразумець, што не збіраюцца адмовіцца ад спроб адхіліць Дональда Трампа ад улады. Гэтае галасаванне, зрэшты, не азначае, што прэзідэнт Злучаных Штатаў павінен будзе пакінуць сваю пасаду: афіцыйна абвешчаны імпічмент не перашкодзіць яму абірацца на наступны тэрмін.

## Улады Францыі пачалі перамовы з прафсаюзамі

Прэм'ер-міністр краіны Эдуар Філіп сустрэўся з Філіпам Марцінесам — лідарам CGT (Усеагульнай канфедэрацыі працы), які рашуча выступае супраць пенсійнай рэформы ў прапанаваным выглядзе. Перш за ўсё CGT не падабаецца, што можа з'явіцца сістэма налічэння балаў, якая будзе залежаць ад працягласці пенсійных адлічэнняў. Яшчэ адзін прафсаюз — Французская дэмакратычная канфедэрацыя працы — згодны на пераход да сістэмы балаў. Але абодва найбуйнейшыя ў краіне аб'яднанні работнікаў катэгарычна супраць увядзення так званага ўзросту раўнавагі — 64 гады. Згодна з планам урада, французы, як і раней, змогуць выходзіць на пенсію пасля дасягнення 62 гадоў. Але для атрымання выплат у поўным аб'ёме трэба будзе адпрацаваць яшчэ два гады. Як толькі ўлады растлумачылі галоўныя палажэнні рэформы, у Францыі пачаліся магутныя акцыі пратэсту, якія не спыняюцца і па гэты дзень. Ад забастоўкі чыгуначнікаў пакутуюць жыхары Парыжа і іншых буйных гарадоў. Сітуацыя ўскладняецца тым, што набліжаюцца калядныя святы. Таму перад уладамі стаіць задача дабіцца ў гэты перыяд «перамір'я» з прафсаюзамі. Прэзідэнт Францыі, адзначаючы ў Елісейскім палацы, паабяцаў палепшыць пенсійны праект шляхам перамоў, але не мае намеру ад яго адмаўляцца.

## СААЗ: глабальная тытунёвая эпідэмія ідзе на спад



Колькасць курцоў па ўсім свеце паступова змяншаецца, прычым у апошнія гады менш курыць сталі не толькі жанчыны, але і мужчыны. Такія вынікі маштабнага даклада, які падрыхтавалі экспертамі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і падводзіць вынікі «глабальнай тытунёвай эпідэміі» апошніх двух дзесяцігоддзяў. «На працягу многіх гадоў мы назіралі бесперапынны рост колькасці спажыўцоў тытуню сярод мужчын. Але цяпер гэты паказчык упершыню стаў зніжацца», — заявіў генеральны дырэктар арганізацыі Тэдрас Гебрэісус, назваўшы гэта паваротным пунктам у барацьбе з тытунём. Асноўнай прычынай змяншэння колькасці курцоў, па словах кіраўніка СААЗ, сталі больш жорсткія меры, прынятыя ў большасці краін накont тытунёвай прамысловасці ў апошнія гады. Цяпер сумнае лідарства па ступені распаўсюджанасці гэтай шкоднай звычкі дзеляць карлікавыя астраўныя дзяржавы Науру і Кірыбаці — там курыць больш за палову насельніцтва краіны (52 %). За імі ідуць Тувалу (49 %), М'янма (45 %), Чылі (45 %), Ліван (43 %) і Сербія (41 %). Паводле апошніх звестак, на сёння курыць (або ўжывае тытунь у іншым выглядзе) у сярэднім амаль кожны чацвёрты жыхар планеты. 80 працэнтаў з іх — мужчыны. Усяго ў свеце налічваецца каля 1 млрд 337 млн курцоў.




## НА РЭЧКУ... З НОВЫМ РЫШТУНКАМ

Рыбалка — гэта, што ні кажы, цікавы занятак! Не, аматарка не я — мой муж. Я проста рыбу люблю і packets назіраць, як ён на рэчку збіраецца. Спачатку гадзін на дзесяць замочвае грушу, даводзіць да кіпення, пяць хвілін варыць, потым агонь выключае, праз паўгадзіны зноў уключае (і так разы з чатыры)... Пену яшчэ здымае, дабаўляе для паху адмысловы алей... Мне цікава, для чаго, бо здаецца, што рыбе ўсё роўна, але ж я ў гэтую справу не ўмешваюся. Ведаю толькі, што для прынады муж выкарыстоўвае гарох, кукурузу, шыцік, што на пачатку вясны ў халадзільніку магу лёгка «знайсці» матыля (паскудства — якога свет не бачыў!..).

Цікава паназіраць і за тым, як рыхтуюцца снасці: пальцы ў чалавека вялікія, нязграбныя, кручочак маленькі, а лёску — мала таго што трэба зацягнуць, дык яшчэ і завязаць на адмысловы вузельчык!

Апроч таго, час ад часу муж любоўна перабірае вудачкі, мацуе катушку да спінінга...

Дык вось, неяк падчас такіх «пераробраў» заходзіць да нас сусед Анатоль. Хваліцца:

— Я не рыбак, але сёння — таксама з уловам. Ды яшчэ і з якім!

А далей пачынае расказваць, як на днях з'ездзіў у горад да сястры, як ля кантэйнераў са смеццем убачыў скручаны дыван і не змог «прайсці міма» — дапусціць, каб дабро прапала...

Карацей, загрузіў яго ў багажнік, прывёз дадому, памыў у сваёй рэчачцы. Праўда, вынік яму не вельмі спадабаўся — вырашыў яшчэ ў вадзе патрымаць, каб намок-папаласкаўся: скруціў, як было, і пакінуў ля берага, а раніцай з жонкай насілу выцягнуў... Думаў, гэтак набрак...

Але ж пагрузілі на тачку, прывезлі. Дома засталося толькі ўскінуць на жэрдачку, каб прасох. Пацягнулі за край і вачам не паверылі: са скруткі стала вывальвацца рыба, прычым шмат — жонка дзве патэльні насмажыла!

— Вось такая ў мяне рыбалка! Не тое што ў цябе, — сказаў сусед майму чалавеку.

Той, гляджу, пачухаў патыліцу, відаць, падумаў, што, можа, і сапраўды лепей з дываном на рыбалку паехаць. Але ж потым махнуў рукой і стаў складаць свае вудачкі.

**Ірына Салата,**
*г. Гродна.*

## НА ДОБРЫ ЎСПАМІН...

У нашым вайсковым падраздзяленні Валодзька Плацыцын быў чалавек паважаны — як-ніяк фатограф. І не абы-дзе, а пры штабе палка. Але ж ён гэтым не дужа задаваўся: пры нагодзе здымаў і сваіх саслужыўцаў, праўда, не дарма: тыя па чарзе вадзілі Валодзьку ў салдацкую кавярню. У выніку пуза ў фатографа расло як на дражджах. «Паглядзі на сябе ў люстэрка, — сварыўся на хлопца старшына. — Дзе я на цябе адзенне вазьму? Танк лягчэй апрануць...»

Валодзька не злаваўся і сваё не кідаў: ледзь не штодня чарговы «кліент» вёў яго на перакус у кавярню, ад чаго фатограф яшчэ болей таўсцеў.

Але ж потым і зусім нечакана для ўсіх ён перастаў «прымаць заказы»: разам з двума «дзембелямі» — Мішам і Жэнем — сышоў у падполле...

Усё стала ясна глыбокай ноччу, калі гэтая тройца пачала па адным будзіць байцоў, а потым — як толькі тыя прадзіралі вочы — здымаць. Фоткі выходзілі — што трэба: без смеху не глянеш...

Карацей, пакуль рота зразумела, што да чаго, большасць байцоў была «сфоткана», і дзён праз колькі Валодзька ўжо дэманстраваў нам агульны здымак. На ім, у маленькіх авалах, красаваліся смешныя твары саслужыўцаў — з прозвішчамі-імёнамі ўнізе і надпісам (уверсе): «Где же вы теперь, друзья-однополчане?»

...Адказаць на гэта пытанне дапамог інтэрнэт: першы і з далёкага Абакана на яго адгукнуўся Слава Кузьмін кароткім: «Здароў, пагроза блока НАТА!»

І быццам не было дзесяцігоддзяў жыцця паасобку, быццам мы з ім паранейшаму ў салдацкай курылцы...

**Генадзь Мішчук,**
*в. Вотчына, Маларыцкі раён.*

## СВАТАННЕ СТУДЭНТА

...Ва ўніверсітэце наша Галя вучылася слаба, а значыць, на добрае размеркаванне разлічваць не магла. Усе надзеі былі на ўдалае замужжа, тым больш што кавалераў вакол кружылася шмат... Але ж як толькі заходзіла размова пра вяселле, тыя часусцы знікалі.

І тут Галя ўспомніла, што да яе хай некалі, хай вельмі сарамліва, але ж заляцаўся Лёнік, тады (па яе словах) «недамерак і мамчын сынок, калабок у акулярах з тоўстымі шкельцамі», а цяпер — найлепшы студэнт курса, можа, нават будучае свяціла навукі! (Ну чаму б і не, калі памяць мае проста фенаменальную, заняткі не прапускае, на піва ды вечарынкі не ходзіць...)

Як падступіцца да яго, дзяўчына доўга не думала: папрасіла дапамагчы ў нейкіх пытаннях па сваёй дыпломнай рабоце. І потым, падчас гэтых кансультацый, так шчыра захаплялася ягонымі ведамі, так нястомна хваліла здольнасці, так замілавана глядзела ў вочы і так дарэчы на 23 лютага падарыла любімую кнігу Пікуля, што Лёнік, нядоўга думаючы, здаўся. Ён дапісаў гэтай чароўнай дзяўчыне дыпломную работу, 8 сакавіка падарыў ёй і атрымаў такую падзяку, пасля якой як чэсны чалавек проста абавязаны быў жаніцца.

Галя, аднак, падзей не прыспешвала, але ж у вёску да бацькоў з'ездзіла. Яе матулю вельмі зацікавіла перспектыва займець гадоў праз дзесяць зяця-прафесара, чаго не мела ніводная баба ва ўсім наваколлі. І нават бацьку, які некалі цераз пень-калоду скончыў восем класаў, але праз прыродны розум (як ён лічыў) стаў загадчыкам склада, здалося, што ёсць нейкі толк у вышэйшай адукацыі: як-ніяк дачка з рамантычнай летуценніцы ператваралася такі ў досыць практычную маладзіцу.

З мамай яны нетаропка паклеілі ў хаце шпалеры, пафарбавалі вокны і падлогу. Бацька тым часам з калгаснай збажыны замовіў самагонкі.

На развітанне дачка папрасіла яго не мацюкацца пры будучым зяцю — хаця б да вяселля. Матулю, якая доўгімі зімнімі вечарамі глядзела бясконцыя меладрамы, вучыць харошым манерам патрэбы не было.

...У апошнюю суботу красавіка Лёнік прыехаў на так званыя аглядзіны.

З дарогі яны добра перакусілі. Потым жанчыны засталіся ў хаце мыць посуд ды ладзіць святочную вячэру, мужчыны пайшлі знаёміцца з сялібай. Асаблівую ўвагу звярнулі на лазню — гаспадар спецыяльна пратапіў яе дзеля шаноўнага госця, якому ўсяго і даручалася, што занесці вёдзер колькі вады.

**Лот № 1**. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 223/U-9540, назначение – сооружение неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., Шарковщинский район, Радюковский с/с, д. Буки, ул. Полевая, 1А. Составные части и принадлежности: шахтный колодец, литер Д – готовность: 80 %, материал – железобетон; ограждение для вольеров, литер Е – готовность: 50 %, высота: 2.00 м, длина: 190,37 м; мини-кафе на 30 посетителей, литер А(А1/д) – готовность: 41 %, площадь застройки – 120 кв. м; два гостевых домика, литеры Б (Б1/д), В (В1/д): готовность гостевого домика, литер Б (Б1/д): 19 %, площадь застройки – 27 кв. м, готовность гостевого домика, литер В (В1/д) – 19 %, площадь застройки – 58 кв. м, домик рыбака, литер Г(Г1/д) – готовность: 54 %, площадь застройки: 44 кв. м. Объект расположен на земельном участке с кадастровым № 225581700010000032 (договор аренды земельного участка по 02.02.2065) площадью 1,5052 га по адресу: Витебская обл., Шарковщинский район, Радюковский с/с, д. Буки, ул. Полевая, 1А, целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания объекта придорожного сервиса. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена**: 44 760,00 бел. руб. с НДС. Задаток 4 476,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 21.01.2020 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 20.12.2019 с 08:30 по 20.01.2020 до 17:30. **Задаток перечисляется на р/с** ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. **Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

**Условия аукциона**: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона (в т. ч. затраты по оценке имущества в сумме 225,50 бел. руб. с НДС на р/с, указанный в протоколе аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 14 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплатить предмет торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи.

**Аукцион проводится** в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ — копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ — доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр.лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя — доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица — также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел: +375 (212) 24-63-12, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Конт. лицо для осмотра объекта: Перхурович Олег Мечеславович, конт. тел. +375 (33) 346-59-99

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** У пачатку тыдня з вамі будзе цяжка дамовіцца, так што канфлікту не пазбегнуць. Паспрабуйце хутчэй уладзіць усе непаразуменні, каб яны не сапсавалі вам свята. Выкрываючы недахопы іншых, памятайце і пра ўласную недасканаласць. У канцы тыдня дзеці будуць радаваць сваімі поспехамі і дасягненнямі. Сабранасць і засяроджанасць дазволяць тварыць цуды. У нядзелю пазбягайце паездак, не патрэбных вам асабіста.

**ЦЯЛЕЦ.** У аўторак непашанцаванне ў дробязях можа выклікаць раздражненне, паспрабуйце пазбегнуць канфліктаў. Серада дасць магчымасць пакінуць многія праблемы ў мінулым. У чацвер пастарайцеся засцерагчы сябе ад бясплённых размоў і непатрэбных кантактаў. У пятніцу вас чакае вясёлая вечарынка з сябрамі. Выхадныя прысвяціце падрыхтоўцы да Новага года.

**БЛІЗНЯТЫ.** Надыходзіць час выканання жаданняў і цудаў. Тыдзень радасны, напоўнены прыемнай мітуснёй. Вас чакаюць зносіны з цікавымі людзьмі, запрашэнні на спатканні. На рабоце спатрэбяцца такія якасці, як пунктуальнасць і спакой, праз іх вы раскрыеце ва ўсім бляску свой прафесіяналізм. Чацвер — удалы дзень для пакупак. Можаце разлічваць на дадатковы прыбытак, так што будзе магчымасць парадаваць сябе і сваіх блізкіх.

**РАК.** У панядзелак у нефармальнай абстаноўцы можна будзе вырашыць вельмі значныя пытанні. Перад вамі могуць адкрыцца новыя магчымасці. У сераду не варта шмат гаварыць і ўдзельнічаць у інтрыгах. У сярэдзіне тыдня не афішуйце свае планы на новы год. У нядзелю не варта залішне захапляцца раздачай каштоўных указанняў і крытычных заўваг, каб не атрымаць у адказ ад блізкіх людзей шквал эмоцый.

**ЛЕЎ.** Тыдзень абяцае падарыць казачныя магчымасці, калі не будзеце забываць працягваць руку дапамогі блізкім і сябрам. Сітуацыя зручная для кантактаў, супрацоўніцтва, цікавых паездак, незвычайных вечарынак. Сямейныя праблемы пачнуць незаўважна знікаць. Вы, як магніт, прыцягваеце да сябе ўдачу. Найбольш спрыяльныя дні будуць чацвер і нядзеля.

**ДЗЕВА.** Паспрабуйце быць больш шчырыя з блізкімі людзьмі. Ды і ад калег не варта мець сакрэтаў. Тыдзень поўны падзей і разнастайных прыгод, толькі пры неабходнасці пажадана своечасова спыніцца. Вы маглі запланаваць зашмат — магчыма, давядзецца адмовіцца ад часткі вызначанага, але гэта не нагода для засмучэння. У нядзелю навядзіце парадак у думках, рэчах і паперах. Падрыхтуйце дом да свята.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні ўстрымайцеся ад рызыкоўных задум і занадта вялікіх выдаткаў. Старайцеся пазбягаць масавых мерапрыемстваў, правядзіце лепш час далей ад натоўпу, бо сярод вялікай колькасці людзей вы можаце прыцягваць небяспечных суседзяў. У сераду ўсё будзе складацца выдатна — чакаюцца цікавыя сустрэчы і прыемныя сюрпрызы. У выхадныя прысвяціце адпачыць і аднавіць сілы, канцэнтравацца варта толькі на самых важных і неадкладных справах.

**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні важна праяўляць ініцыятыву і ўсяляк дэманстраваць сваю актыўнасць. Асабліва карысныя такія паводзіны будуць для кар'ернага росту. З'явіцца магчымасць добра зарабіць, але спатрэбіцца цярпенне і зацятасць. Блізкім важныя вашы спагада і ўвага, і вы з задавальненнем падорыце ім святочны настрой.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні вы павінны быць адкрытыя для прапаноў, і яны пачнуць паступаць у нарастаючым тэмпе. У вырашэнні дзелавых пытанняў больш спадзявайцеся на інтуіцыю — як ні дзіўна, логіка наўрад ці прывядзе да жаданых вынікаў. У чацвер не варта здзяйсняць бездакзных учынкаў, нават такіх, якія здаюцца дробязнымі. У канцы тыдня вас чакаюць вясёлыя вечарынкі.

**КАЗЯРОГ.** Па магчымасці разбярыцеся з абавязкамі, не адкладайце на новы год незавершаныя справы. У аўторак давядзецца прыняць адказнасць не толькі за свае дзеянні і ўчынкі, але і за іншых людзей. У чацвер будзеце схільныя згушчаць фарбы, што можа скончыцца канфліктнай сітуацыяй. У суботу могуць цалкам памяняцца планы наконт сустрэчы Новага года.

**ВАДАЛІЎ.** Вам неабходна дакладна распланаваць тыдзень і вырашыць для сябе, чаго канкрэтна вы хочаце дасягнуць. Як толькі вы здолееце гэта зрабіць, адразу ж разграбіце завалы спраў і праблем. Да вашых ідэй будуць прыслухоўвацца, хоць, магчыма, вы не заўсёды лёгка зможаце знайсці партнёраў для іх рэалізацыі. Сябры дапамогуць развеяцца, правядзіце з імі больш часу. У выходныя будзеце здольныя завяваць не адно сэрца сваёй рашучасцю, упэўненасцю ў сабе і абаяннем.

**РЫБЫ.** У панядзелак запланаваная паездка або камандзіроўка акажацца вельмі ўдалай. Вас чакаюць новыя знаёмствы, жыццё наогул можа крута змяніцца менавіта цяпер. Прывядзіце ў парадак усе дакументы, гэта атрымаецца лёгка і паспяхова. На рабоце выяўляйце настойлівасць, бароніце свае інтарэсы, і поспех вам забяспечаны. Пазбягайце хатніх канфліктаў, будзьце асабліва ўважлівыя да бацькоў.

## Даты · Падзеі · Людзі

**20 СНЕЖНЯ**

**У краіне**



**1899** год — нарадзіўся Уладзімір Зянонавіч Царук, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны (партызанскі псеўданім «дзядзя Валодзя»), Герой Савецкага Саюза. Памёр у 1957 годзе.

**1904** год — нарадзіўся Аляксандр Аляксандравіч Даброцін, беларускі і расійскі акцёр, рэжысёр і педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі. Працаваў у тэатрах Ленінграда, Ташкента, узначальваў тэатры ў Мурманску, Ніжнім Ноўгарадзе, Уладзівастоку, Курску, Варонежы. У 1966—1968 гадах быў галоўным рэжысёрам Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларусі. Памёр у 1985 годзе.

**1909** год — нарадзіўся Мікіта Рыгоравіч Кавалёў, Герой Савецкага Саюза. Ураджэнец Гомельскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, Варонежскім, 1-м і 2-м Украінскім, Забайкальскім франтах. Гвардыі маёр Кавалёў вызначыўся ў баях пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Кіева ў лістападзе 1943 года. Памёр у 1978 годзе.

**1919** год — нарадзіўся Вячаслаў Іванавіч Чамадураў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. Ваяваў на Бранскім, Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах. Удзельнік баёў на Курскай дузе. Камандзір кулямётнага разліку сяржант Чамадураў асабліва вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобласці ў баі за вёску Рудня Слаўгарадскага раёна. Памёр у 1957 годзе.

**1939** год — у Гомелі адкрыты абласны драматычны рускі тэатр.

**1964** год — Маладзечанская фабрыка музычных інструментаў выпусціла 100-тысячны гармонік «Беларусь».

**У свеце**

**1699** год — быў выдадзены імянны ўказ Пятра І «Аб святкаванні Новага года». Указам прадпісвалася рабіць адлік гадоў не «ад стварэння свету», а ад Нараджэння Хрыстовага, а навалецце пачынаць не з 1 верасня, а з 1 студзеня, як гэта рабілася ў многіх еўрапейскіх краінах.

**1917** год — створана Усерасійская надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам. Яе першым старшынёй быў прызначаны прафесійны рэвалюцыянер з 20-гадовым вопытам падпольнай работы 40-гадовы Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі, ураджэнец Дзяржынава, цяперашні Стаўбцоўскі раён.

**1949** год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР заснавана Міжнародная Сталінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі».

**1989** год — амерыканскія войскі ажыццявілі ўзброеную інтэрвенцыю ў Панаму. У ходзе ваеннай аперацыі, па афіцыйных даных, загінула 500 чалавек.

**1999** год — тэрыторыя Макаа, якая 442 гады была каланіяльным уладаннем Партугаліі, стала асобным адміністрацыйным раёнам Кітая.



# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.25 | 16.48 | 7.23 |
| Віцебск — | 9.23 | 16.30 | 7.07 |
| Магілёў — | 9.16 | 16.38 | 7.22 |
| Гомель — | 9.03 | 16.44 | 7.41 |
| Гродна — | 9.39 | 17.05 | 7.26 |
| Брэст — | 9.31 | 17.15 | 7.44 |

## Месяц

*Апошняя квадра 19 снежня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

*Пр. Антона, Івана, Міхаіла, Нікіфара, Ніла, Паўла, Сяргея.*
*К. Дамініка, Ігната, Яўгена.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў




## УСМІХНЕМСЯ

— Ну і як з ім у ложку?
— Усё жыццё пра гэта марыла!
— Я, напэўна, таксама сабе ноўтбук куплю.

**Бабуля з унучкай два тыдні гулялі ў школу. І толькі ў канцы другога тыдня бабуля здагадалася, што робіць за яе дамашняе заданне.**

— Вова, калі ты ўжо нарэшце ажэнішся?
— Ведаеш, Васіль, ніяк не магу выбраць паміж дзвюма кандыдатурамі: у адной дзень нараджэння 8 сакавіка, а ў другой — 29 лютага.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4273.
Нумар падпісаны ў 19.30 19 снежня 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

20 снежня 2019 г. № 50 (535)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


УЛАСНЫ БІЗНЕС

## ХЛЕБНАЯ СПРАВА



**Мясцовая бізнес-ініцыятыва Вольгі і Уладзіслава ЯЎГРАФАВЫХ за лічаныя месяцы ператварыла маладую сямейную пару з Лоева ў матыватараў развіцця прыватнай справы ў гомельскай глыбінцы. Вольга і Уладзіслаў маюць уласную хлебабулачную вытворчасць у аддаленым пасёлку гарадскога тыпу. У датацыйным раёне ствараюць новыя рабочыя месцы, павышаюць кваліфікацыю спецыялістаў і ўласным прыкладам паказваюць, як змагацца за сваю справу.**

— Наша гісторыя не пра стартап, не пра самазанятасць як нейкі маладзёжны праект, — з першых хвілін размовы папраўляе Вольга Яўграфава.

У сямейным бізнесе яна галоўны менеджар, юрыст, маркетолаг і спецыяліст па сувязях з грамадскасцю ў адной асобе.

— Мы, як многія маладыя пары ў глыбінцы, ужо пакавалі чамаданы і планавалі перабірацца на ПМЖ у Гомель. Шукалі там работу. Потым вырашылі: дадзім Лоеву — самай дарагой сэрцу мясціне — апошні шанц застацца ў нашым жыцці.

На руках маленькая дачка, ніякага вопыту вядзення бізнесу, невялічкія сямейныя зберажэнні і апантанае жаданне падарыць сабе, сябрам, знаёмым, суседзям і ўсім мясцовым магчымасць мець на стале духмяны, свежы хлеб.

стар. 4



ЯК ПРАЦУЮЦЬ ЗАКОНЫ

## НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ПАЛЕСКАГА ЗАПАВЕДНІКА

**Падчас наведвання Прэзідэнтам Беларусі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка было дадзена даручэнне — павялічыць колькасць відаў эксперыментальнай і гаспадарчай дзейнасці на яго тэрыторыі.**

З улікам гэтага былі распрацаваны і прыняты папраўкі ў дзеючае заканадаўства, у прыватнасці, абноўлены Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

Новае заканадаўства ўвайшло ў сілу ў канцы лістапада гэтага года. Што змянілася ў запаведнай зоне пасля яго ўвядзення? Пра гэта ў інтэрв'ю «МС» расказаў **дырэктар запаведніка Міхаіл РУБАШЧАНКА.**

стар. 15



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### СЁННЯ Ў НУМАРЫ

**Стратэгічны вектар**



Беларусь і Кітай звязваюць усебаковыя партнёрскія і сяброўскія адносіны. стар. 2

**На шляху да Мэт**



Ад рэалізацыі захадаў па дасягненні Мэт устойлівага развіцця залежыць павышэнне ўзроўню жыцця кожнага. Што для гэтага трэба? стар. 3

**Далікатэс пакаштуеце?**



Беларускі слімак не можа трапіць у Еўропу, а нашы суайчыннікі яшчэ толькі вучацца культуры яго спажывання. стар. 13

**Калі фінансы спяваюць рамансы,**



або Чаму не ўсе наймальнікі Міншчыны своечасова разлічваюцца з работнікамі. стар. 14

**Паэтычныя муралы**



У цэнтры Брэста на сценах дамоў з'явіліся вершы Максіма Багдановіча, Генадзя Бураўкіна і Ніны Мацяш. стар. 16

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# Па поклічы сэрца

**Так пасля заканчэння сваёй дыпламатычнай місіі ў адносінах да нашай краіны будзе працаваць Кезбан Нілвана ДАРАМА, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турцыі ў Беларусі. Напярэдадні развітання з кіраўніком пасольства сустрэўся старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

Ён падкрэсліў, што за час кадэнцыі Кезбан Нілвана Дарама добра пазнаёмілася з гісторыяй, традыцыямі і насельніцтвам Беларусі: «Але самае галоўнае, што вы ўпэўніліся: наша краіна зацікаўлена ў развіцці супрацоўніцтва з Турэцкай Рэспублікай. Мы лічым, што дзякуючы такой вашай актыўнай рабоце пашырыліся кантакты паміж нашымі дзяржавамі. У нас сёння няма праблемных пытанняў, і адносіны Турцыі і Беларусі развіваюцца паступальна ўсе гады. І вельмі важна, што яны ніколі не супыняліся».

За час работы спадарыні Дарамы былі падрыхтаваны візіты прэзідэнтаў краін, рэгулярны характар мае і парламенцкае ўзаемадзеянне. Уладзімір Андрэйчанка выказаў надзею, што яна перадасць свае напрацоўкі пераемніку на пасадзе кіраўніка дыпламатычнай місіі ў Беларусі. Гэта будзе спрыяць наладжванню кантактаў з Мустафой Шэнтопам, спікерам парламента (Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі).

З Турцыяй сёлета апрабаваны новы кірунак супрацоўніцтва — кансультацыі паміж камісіямі па міжнародных справах двух парламентаў. Так, у верасні адбылася сустрэча Уладзіміра Андрэйчанкі з парламенцкай дэлегацыяй на чале са старшынёй камісіі Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі па замежных справах Валканам Базкырам. «Я лічу, што гэта добры прыклад. У нас ні з адным парламентам такіх кансультацый не праводзілася, таму нам трэба гэта абавязкова захаваць і нешта новае прыдумаць», — адзначыў спікер Палаты прадстаўнікоў.

Краінам неабходна развіваць супрацоўніцтва на пляцоўцы Парламенцкай асамблеі АБСЕ. У студзені будзе зацверджаны склад беларускай дэлегацыі ў міжнародных парламенцкіх арганізацыях. Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, кіраўніцтва ніжняй палаты Нацыянальнага сходу парэкамендуе, каб дэлегацыю ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ ўзначаліў **Андрэй САВІНЫХ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах.**

За мінулы год краіны ўзмацнілі свае гандлёвыя адносіны, абарот якіх склаў амаль адзін мільярд долараў. Задача, пастаўленая прэзідэнтамі дзвюх краін, якую давядзецца вырашаць і будучаму паслу, — 1,5 мільярда.

Як расказаў Андрэй Савіных, тавараабарот цяпер неабходна збалансаваць і зрабіць больш устойлівым. Садзейнічаць гэтаму можа і парламент. «У міжпарламенцкіх кантактах мы абмяркоўваем таксама і пытанні сацыяльна-эканамічнага характару. Тут некалькі момантаў, якія маюць прыярытэтны інтарэс. Па-першае, гэта транспартнае супрацоўніцтва. У рамках гэтай тэмы мы абмяркоўваем магчымасць водных зносін паміж Турцыяй і Беларуссю па рацэ Дняпро з выкарыстаннем суднаў тыпу «рака — мора». Другі момант — гэта прыцягненне турэцкіх інвестыцый і адкрыццё турэцкай вытворчасці для стварэння тавараў, якія будуць пастаўляцца на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза. І трэцяе — гэта смялейшыя крокі па адкрыцці беларускіх зборачных вытворчасцяў у Турцыі. Калі мы гэта зробім, мы зоймем сваю нішу на рынку Турцыі назаўсёды», — канстатаваў Андрэй Савіных.

У горадзе Кырыкале супольна з азербайджанскімі калегамі наладжана вытворчасць па зборцы трактараў, зараз ідзе адпаведная размова па лініі «Гомсельмаша» і «Амкадора».

Кезбан Нілвана Дарама падкрэсліла, што застанецца не афіцыйным, а па поклічы сэрца прадстаўніком Беларусі ў Турцыі. Яна адзначыла асаблівую дапамогу нашага парламента ў наладжванні сувязяў паміж краінамі і павіншавала Андрэя Савіных, былога калегу (раней ён узначальваў беларускае пасольства ў Турцыі), з выбраннем на пасаду старшыні профільнай камісіі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# УСЕБАКОВАЕ СТРАТЭГІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Цуй ЦЫМІНАМ, паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента.**


Фота БелТА.

Беларусь і Кітай з'яўляюцца надзейнымі сябрамі і партнёрамі, якіх звязвае ўсебаковае стратэгічнае супрацоўніцтва, падкрэсліла Наталля Качанава. У аснове двухбаковых сувязяў — цёплыя і даверлівыя адносіны паміж кіраўнікамі дзяржаў.

«Мы ганарымся добрымі адносінамі з Кітаем. Гэта сапраўды сяброўства пры любым надвор'і, жалезнае брацтва, — адзначыла старшыня Савета Рэспублікі. — Мы ўдзячныя Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіну, Ураду Кітая за тую ўвагу, якую яны ўдзяляюць супрацоўніцтву з Рэспублікай Беларусь».

Наталля Качанава запэўніла, што новы склад Савета Рэспублікі будзе прыкладаць намаганні для далейшага развіцця міжпарламенцкіх сувязяў з Кітаем, рэалізацыі дасягнутых раней дамоўленасцяў. «Мы працягнем рабіць усё магчымае, для таго каб нашы міжпарламенцкія сувязі працягваліся і выстройваліся ў самым канструктыўным рэчышчы. У найбліжэйшы час у нас будзе сфарміравана рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам Кітая», — заявіла яна.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама дадала, што паміж дзвюма краінамі актыўна развіваюцца не толькі палітычныя і гандлёва-эканамічныя сувязі, але і гуманітарнае партнёрства, маладзёжныя кантакты. Беларускія школьнікі і студэнты вывучаюць кітайскую мову. Усё гэта стварае добрую аснову для далейшага развіцця двухбаковага супрацоўніцтва.

У сваю чаргу, Цуй Цымін павіншаваў Наталлю Качанаву з абраннем на пасаду старшыні Савета Рэспублікі і перадаў словы віншавання ад імя кіраўніцтва Пастаяннага Камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў. Пасол адзначыў поспехі супрацоўніцтва з Беларуссю ў рамках глабальнага праекта «Адзін пояс, адзін шлях», звярнуў асаблівую ўвагу на развіццё Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Ён таксама выказаў гатоўнасць кітайскага боку і надалей умацоўваць двухбаковыя сувязі, у тым ліку на парламенцкім узроўні.

Адказваючы на пытанні журналістаў па выніках сустрэчы, пасол адзначыў, што падпісанае крэдытнае пагадненне паміж краінамі будзе спрыяць актывізацыі інвестыцыйнага супрацоўніцтва, рэалізацыі новых сумесных праектаў.

У студзені—кастрычніку 2019 года тавараабарот Беларусі з Кітаем дасягнуў 3,8 мільярда долараў, што на 25,5 % больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Экспарт за гэты перыяд склаў 608,1 мільёна долараў, імпарт — 3,2 мільярда долараў.

НА ПЕРСПЕКТЫВУ

# ДАРОГУ РЭГІЁНАМ

## Як унесці канструктыў у эканамічнае ўзаемадзеянне краін

**Першая міжнародная сустрэча Наталлі КАЧАНАВАЙ у якасці старшыні Савета Рэспублікі адбылася ў рамках афіцыйнага візіту парламенцкай дэлегацыі В'етнама на чале са старшынёй Нацыянальнага сходу Нгуен Тхі Кім Нган.**

У час размовы, якая прайшла ў атмасферы добразычлівасці і даверу, Наталля Качанава адзначыла, што даўнія і трывалыя адносіны паміж беларускім і в'етнамскім народамі цяпер выходзяць на якасна новы ўзровень развіцця. У прыватнасці, ствараюцца перадумовы для рэалізацыі новых сумесных праектаў, знешнепалітычных і знешнеэканамічных ініцыятыў. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічае міжпарламенцкае супрацоўніцтва. Таму Наталля Качанава прапанавала інтэнсіфікаваць парламенцкія кантакты.

Давайце паглядзім, а што канкрэтна могуць зрабіць парламентарыі для ажыўлення і паглыблення эканамічных стасункаў дзвюх краін? Ды многае. Ну хоць бы па меры сваіх магчымасцяў спрыяць узаемадзеянню рэгіёнаў. Паводле слоў Наталлі Качанавай, у Мінску парламентарыі дамовіліся садзейнічаць пашырэнню кантактаў на рэгіянальным узроўні. Старшыня Нацыянальнага сходу В'етнама ў сваю чаргу заўважыла, што на фоне дынамічнага палітычнага дыялогу, умацавання гандлёва-эканамічных сувязяў развіваецца і міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. А гэта, на яе думку, таксама стварае добрую аснову для паглыблення двухбаковых адносін.

Каб больш эфектыўна выкарыстоўваць значны патэнцыял узаемавыгаднага супрацоўніцтва ў эканоміцы, трэба расчысціць дарогу рэгіёнам. А яны, ёсць надзея, паспрабуюць змяніць застылую структуру ўзаемнага гандлю Беларусі, краін ЕАЭС і В'етнама. За рэдкім выключэннем, асартымент тавараў дзесяцігоддзямі не мяняецца. Традыцыйна В'етнам у Беларусь, як і ў іншыя краіны ЕАЭС, пастаўляе сродкі сувязі, каўчук, арэхі, чай, каву, морапрадукты, ананасы і г. д. Ад нас ідуць калійныя ўгнаенні, грузавікі, трактары, іншая тэхніка, лекі, шыны. Рэдкія выключэнні ў гэтым спісе тавараў не робяць надвор'я ў гандлі. Праўда, апошнім часам в'етнамцы ўсё больш праяўляюць цікавасць да беларускіх малочных і мясных прадуктаў, шэрагу іншых тавараў. Так, у В'етнаме завяршаецца падрыхтоўка да пуску ў эксплуатацыю сумеснай малочнай вытворчасці. Там у наступным годзе з сухога беларускага малака будуць вырабляць малочныя прадукты. У В'етнаме ўжо працуе зборачная вытворчасць грузавікоў МАЗ.

І гэта добрыя знакі для рэгіёнаў. Наталля Качанава ў ходзе перагавораў адназначна выказалася за працяг прамысловай кааперацыі з мэтай выхаду з сумеснай прадукцыяй на рынкі іншых краін у перспектыве. А В'етнаму яна прапанавала больш актыўна пашыраць сваю прысутнасць на беларускім рынку.

Адносна нядаўна ставілася задача давесці тавараабарот паміж дзвюма краінамі да 500 млн долараў ЗША. Нагадаем, у 2015 годзе ён склаў 150 млн, што, вядома, не адпавядала эканамічнаму патэнцыялу краін. У 2018 годзе нагандлявалі на 115,3 млн долараў . Праўда, за дзевяць месяцаў гэтага года тавараабарот ужо склаў 153,4 млн. Але і гэта не тая лічба, якая рэальна можа быць дасягнута. Важная ўмова заключаецца ў тым, звярнула ўвагу Наталля Качанава, што нашы эканомікі з'яўляюцца ўзаемадапаўняльнымі, а гэта дазваляе краінам не канкурыраваць, а нарошчваць узаемныя пастаўкі прадукцыі.

Шанцы значна павялічыць тавараабарот ёсць. Напрыклад, в'етнамскія парламентарыі маглі б сказаць сваё слова ў справе спрашчэння доступу беларускіх тавараў на рынак іх і краін АСЕАН, бо існуючыя высокія мытныя пошліны тармозяць развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Думаецца, невыпадкова ў перагаворах з дэлегацыяй В'етнама ўдзельнічаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы. Гэта цяпер і яго клопат — як унесці канструктыў у міжрэгіянальнае супрацоўніцтва краін.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# БУДУЧЫНЮ СТВАРАЕ КОЖНЫ З НАС

## Якую ролю адыгрываюць СМІ ў справе прасоўвання Мэт устойлівага развіцця ў нашай краіне?




**На першым пашыраным пасяджэнні рабочай групы па прасоўванні Мэт устойлівага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь абмеркавалі кірункі работы СМІ па папулярызацыі МУР, а таксама падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу сярод мас-медыя «Ад Глабальных мэт да лакальных дзеянняў».**

Вітаючы ўдзельнікаў пашыранага пасяджэння рабочай групы, **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** падкрэсліў, што беларускія сродкі масавай інфармацыі не проста адзін з асноўных каналаў у справе інфармавання насельніцтва пра Мэты ўстойлівага развіцця. Яны адыгрываюць вялікую ролю ў тым, каб пазнаёміць грамадзян з магчымасцямі прымаць узважаныя і адказныя рашэнні, якія датычацца іх саміх, іх сем'яў, грамадства, а таксама ўплываць на рашэнні ўлад па рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця.

На Першым нацыянальным форуме па ўстойлівым развіцці быў выпрацаваны шэраг новых ініцыятыў. Адной з іх, па прапанове Міністэрства інфармацыі, стала пашырэнне нацыянальнай архітэктуры па дасягненні МУР. Была створана рабочая група па СМІ, куды ўвайшлі прадстаўнікі рэспубліканскіх і вядучых рэгіянальных СМІ. Мэта групы — шырокае інфармаванне грамадскасці аб неабходнасці і механізмах дасягнення паказчыкаў устойлівага развіцця на лакальным, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях.

— Гэтая дзейнасць спалучаецца з дзвюма Мэтамі — 16-й «Садзейнічанне пабудове міралюбнага і адкрытага грамадства» і 17-й «Партнёрства ў інтарэсах устойлівага развіцця», — адзначыла **нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА.** — Без СМІ, без інфармавання насельніцтва, іх усвядомленага ўцягвання ў работу па дасягненні МУР практычна нічога нельга зрабіць. Таму што галоўны прынцып — нікога не пакінуць убаку.

**Пастаянны каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь Іаана КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ** падкрэсліла, што ў наступным дзесяцігоддзі (2020—2030) важна ўдзяліць увагу такім пытанням, як неабходнасць змагацца з няроўнасцю, будаваць міралюбнае, справядлівае і свабоднае ад сацыяльных бар'ераў грамадства, паважаць, абараняць і рэалізаваць правы чалавека, дабівацца гендарнай роўнасці, забяспечыць надзейнае захаванне планеты і яе прыродных рэсурсаў.

— Сёння большасць людзей ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Рэспубліцы Беларусь, жыве лепш, чым дзесяць гадоў таму: маюць доступ да лепшай аховы здароўя, дастойнай работы і адукацыі, — адзначыла Іаана Казана-Вішнявецкі. — Мы часта гаворым, на якіх высокіх пазіцыях знаходзіцца Рэспубліка Беларусь па індыкатарах устойлівага развіцця. І сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць вельмі важную ролю ў тым, каб расказваць пра гэтыя пераўтварэнні.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### Яркая вокладка ці глыбокі сэнс?

Падчас пашыранага пасяджэння прайшла панэльная дыскусія «Унёсак СМІ ў прасоўванне Мэт устойлівага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь». Яе ўдзельнікі паспрабавалі адказаць на пытанні, як эфектыўна паднесці чытачу, гледачу інфармацыю пра МУР, каб не толькі зацікавіць, але і ўцягнуць у працэс іх дасягнення, як зрабіць Мэты больш зразумелымі для аўдыторыі СМІ, на якія з іх варта звяртаць больш увагі.

**Галоўны рэдактар студыі радыё Прадстаўніцтва МДТРК «Мир» Аляксей АЛДАШКІН** падкрэсліў, што сёння мас-медыя могуць прасоўваць нават тыя Мэты, якія, здавалася б, не вельмі важныя для Беларусі, напрыклад, 14-ю «Захаванне марскіх экасістэм». Так, праз праблему засілля пластыкавых пакетаў можна раскрыць уплыў смецця на стан экасістэм мораў і акіянаў.

Прадстаўнікі СМІ таксама паразважалі аб важнасці выбару простай, даступнай мовы для пабудовы такіх матэрыялаў, а таксама наколькі візуальныя сродкі дапамагаюць прыцягнуць увагу да інфармацыі.

— Калі мы кажам пра ахову здароўя, то аснашчэнне якой-небудзь бальніцы, адкрыццё новага медыцынскага цэнтра — гэта і ёсць дасягненне МУР, — выказала думку **намеснік дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны канал» Святлана КНУТАВА.** — Расказваючы пра тую работу, якая праводзіцца ў краіне, СМІ дапамагаюць прасоўваць і рэалізаваць Мэты.

Мар'яна Шчоткіна ўпэўнена: калі мы хочам прыцягнуць увагу, павінны быць і яркія банеры, і кідкія назвы. Бо калі падзея прыцягвае ўвагу, людзі пачынаюць яе вывучаць, і трэба шматгранна яе суправаджаць — і праз людзей, і праз афармленне.

— Мэты ўстойлівага развіцця — гэта не вузкія пытанні, гэта практычна ўсе працэсы, якія адбываюцца ў нас у грамадстве, і ў пэўнай ступені закранаюць усіх нас, — адзначыў **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ.** — Мы ўсе акцэнтуем увагу на яркіх момантах папулярызацыі МУР, але гэта наша штодзённая праца. І афарміўшы яе ў яркую абалонку, мы можам прыцягнуць як мага больш прадстаўнікоў грамадскасці для вырашэння тых праблем, якія стаяць перад грамадствам і дзяржавай.

Гаварылі таксама пра важнасць асвятлення грамадскіх ініцыятыў, якія спрыяюць дасягненню Мэт, і пашырэнне супрацоўніцтва з іншымі рабочымі групамі нацыянальнай архітэктуры Мэт устойлівага развіцця.

* * *

Падчас пасяджэння таксама ўзнагародзілі пераможцаў рэспубліканскага конкурсу па прасоўванні Мэт устойлівага развіцця сярод сродкаў масавай інфармацыі «Ад Глабальных мэт да лакальных дзеянняў». Конкурс быў ініцыяваны і праведзены сёлета Міністэрствам інфармацыі пры падтрымцы ПРААН і ЮНІСЕФ.

На суд журы паступіла каля 100 заявак, каля 1000 матэрыялаў у розных жанрах. Конкурс праводзіўся ў сямі намінацыях, якія датычыліся эканамічнай тэматыкі, уразлівых слаёў насельніцтва, міжведамаснага ўзаемадзеяння, бізнес-праектаў і грамадскіх ініцыятыў, накіраваных на дасягненне Мэт устойлівага развіцця. У намінацыі «Найлепшыя матэрыялы і (ці) цыкл матэрыялаў па экалагічнай тэматыцы ў кантэксце Мэт устойлівага развіцця» перамогу атрымаў калектыў рэдакцыі часопіса «Родная прырода» Выдавецкага дома «Звязда».

— Падчас конкурсу мы адзначылі здольнасць нашых мас-медыя ўзважана, мудра арыентаваць накіраванасць пытанняў парадку ў адпаведнасці з беларускімі рэаліямі, зафіксаваць значнасць МУР у нацыянальным праламленні, стымуляваць зацікаўленасць беларускіх грамадзян да прыняцця адказных рашэнняў, — сказаў Аляксандр Карлюкевіч. — Мы разгледзім мэтазгоднасць далейшага правядзення конкурсу, ён будзе праводзіцца з пэўным інтэрвалам — 1-2 гады.

Мар'яна Шчоткіна падзякавала ўдзельнікам конкурсу за грамадзянскую пазіцыю:

— Калі да гэтай работы не падыходзіць усвядомлена, то нічога не атрымаецца. Калі мы сапраўды хочам прынесці карысць, стварыць грамадства для людзей, то трэба пра гэта казаць, паказваць, пісаць, знаёміць з тымі людзьмі, якія непасрэдна бяруць у гэтым удзел.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

### У НОВЫ ГОД — З НОВЫМІ ПЛАНАМІ

Адказваючы на пытанні журналістаў наконт планаў на 2020 год, Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што налета прыярытэтным кірункам будзе работа рэгіянальных груп. Плануецца таксама правесці маштабны форум па вопыце рэалізацыі Мэт.

— Беларусь у 2020 годзе будзе старшынстваваць у ЕАЭС, і нам бы вельмі хацелася, каб на высокім узроўні, з удзелам «пяцёркі», мы абмеркавалі гэтыя пытанні, — сказала нацыянальны каардынатар. — У кожнай дзяржавы ёсць адна мэта — павышэнне ўзроўню якасці жыцця насельніцтва. Калі мы працуем разам, то нам, зразумела, трэба супрацоўнічаць па ўстойлівым развіцці і наладзіць добрыя каналы па абмене вопытам.

А што датычыцца магчымай змены нацыянальнага каардынатара ў сувязі з пераходам Мар'яны Шчоткінай на новае месца работы, то яна адзначыла, што такое пытанне цяпер абмяркоўваецца:

— Вельмі хацелася б, каб гэта форма работы, гэта пляцоўка засталася за парламентам. Таму што калі нацыянальны каардынатар — прадстаўнік парламента, то гэта прадстаўнік ад грамадства, ён вольны ў прыняцці рашэнняў, незалежны, і ў яго значна больш каналаў для зносін.

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

# БАЛОТЫ СУСВЕТНАГА ЗНАЧЭННЯ

**Тое, што беларускія балоты з'яўляюцца каштоўнасцю сусветнага значэння, чарговы раз нагадалі на апошняй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання падчас ратыфікацыі закона «Аб ахове і выкарыстанні тарфянікаў».**

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** паведаміў, што сёння ў Беларусі ў натуральным стане захавалася 863 тысячы гектараў прыродных балот. Штогод яны паглынаюць сотні тысяч тон шкодных газаў, выдзяляюць у атмасферу 630 тысяч тон кіслароду, з'яўляюцца асяроддзем для многіх відаў жывёл і птушак, насякомых, рэдкіх раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу. У сельскай гаспадарцы сёння выкарыстоўваецца больш за мільён гектараў асушаных земляў, штогод здабываецца прыкладна 2,5 мільёна тон торфу, частка якога ідзе на экспарт.

Разам з тым у выкарыстанні тарфянікаў існуе шэраг праблем, у прыватнасці, парушэнні гідралагічнага рэжыму, лясныя і тарфяныя пажары, зарастанне балотных экасістэм, наяўнасць асушаных балот, якія паступова дэградуюць пасля завяршэння эксплуатацыі тарфяных радовішчаў, і іншыя.

Дарэчы, у свеце ёсць усяго 16 водна-балотных угоддзяў, якім нададзены трансгранічны статус. Чатыры з іх належаць Беларусі. 26 балот уключаны ў так званую Рамсарскую канвенцыю аб водна-балотных угоддзях, якія маюць міжнароднае значэнне. Гэта першы глабальны міжнародны дагавор, цалкам прысвечаны аднаму тыпу экасістэм.

Але апошнім часам распаўсюджваецца абыякавае стаўленне да балот як да нечага пастаяннага і нязменнага, дадзенага нам назаўсёды. У свой час так думалі і пра «бясконцыя» запасы прэснай вады, леднікі, чысціню паветра. (Дарэчы, гектар балота выдзяляе больш кіслароду, чым гектар лесу.)

Нашы балоты — наша багацце, а таму палітыка наведзення парадку на зямлі наўпрост закранае гэтую значную частку (4,2 %) ад агульнай тэрыторыі краіны. З прыняццем згаданага закона (аналагаў яму няма ні на постсавецкай прасторы, ні ў Еўропе) працэс аховы, выкарыстання і кіравання тарфянікамі выходзіць на якасна новы ўзровень.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ХЛЕБНАЯ СПРАВА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

У райцэнтры і раёне даўно склалася несуцяшальная сітуацыя з пастаўкамі хлебабулачных вырабаў. Гэтую нішу намагаўся запоўніць прывазнымі боханамі сеткавы супермаркет. Прадаваўся, але ж слаба, і хлеб райспажыўсаюза.

— Мы марылі не проста пра пякарню — вытворчасць хлеба як машыну часу. Назад, у мінулае, у дзяцінства, калі духмяную цагліну не маглі данесці дадому, з'ядалі па дарозе. Пунктам невяртання стала рэгістрацыя таварыства з абмежаванай адказнасцю. Нельга ўжо «згуляць» у самазанятасць і ўсё кінуць.

Яўграфавы ведалі: будуць вырабляць выпечку толькі без хімічных дадаткаў і кансервантаў. Прызнаюцца: падняць пласт ведаў, уменняў і навыкаў — тэхналагічных і маркетынгавых — было на мяжы іх магчымасцяў. Рызыкоўна і страшна. Вывучалі розныя тэхналогіі працэсу закваскі, расслойкі цеста. Але перш чым выбіраць абсталяванне для будучай пекарні, шукалі, з кім працаваць.

> Дапамагала неяк дзяўчатам за прылаўкам — адпускала нашу «цаглінку» такому самавітаму, вельмі сур'ёзнаму мужчыну, за пяцьдзясят гадоў. Узяў у рукі бохан, а ён гарачы. Мужчына ператварыўся ў дзіця. Скібку адламаў і папрасіў яшчэ адзін — маўляў, з'есць па дарозе, баіцца, не данясе дадому.

— Мы разумелі: падобны вытворчы працэс — хлебнае месца для работнікаў, нячыстых на руку. Таму шукалі спецыялістаў, якія ведалі б працэс і былі сумленныя. Думалі: у Лоеве не так даўно функцыянаваў кандытарскі цэх, павінны застацца спецыялісты, якіх скарацілі. Хлебазавод таксама калісьці працаваў у тры-чатыры змены. Але нікога не маглі знайсці. Больш за ўсё праблем было з добрымі пекарамі. Лёс накіраваў да нас тэхнолага і пекараў — найлепшых з лепшых, можа і ў вобласці. Вельмі сумленныя людзі.

За два месяцы лаяўчане купілі абсталяванне — цестамес і печ, прывялі ў належны выгляд памяшканне, якое дало ў арэнду райспажыўтаварыства. Яўграфавы абышліся без крэдытаў. Сакрэту не робяць — на рамонт памяшкання, закупку сыравіны і абсталявання пайшло без малога 32 тысячы рублёў. У красавіку выдалі першыя пробныя партыі хлеба. Сталася так, што практычна ў гэты ж час перастаў працаваць Лоеўскі хлебазавод. Попыт на хлеб вырас. Аднак узрасла і адказнасць перад спажыўцамі.

— Калектыў складаецца з сямі чалавек: бухгалтара, тэхнолага, прадаўца, двух пекараў. Муж Уладзіслаў стаў дырэктарам. Я і на ўборку, і за прылавак, і па сыравіну. Мая першая спецыяльнасць — сацыяльны псіхолаг, другая — юрыст, гэта дапамагло ў справе.

Спачатку пяклі днём. Потым дзяўчаты-пекары папрасіліся ў начную змену. Праўда, у першы месяц справу ледзь не патапіла арэнда амаль у дзве тысячы рублёў і плата за электраэнергію. Аднак прадпрымальнікі рызыкнулі і ўзялі ў арэнду (чым зрабілі паслугу райспажыўтаварыству) яшчэ і будынак былога кандытарскага цэху, які патрабаваў сур'ёзнага рамонту і проста разбураўся без выкарыстання.

У першым памяшканні цяпер працуе кавярня-пякарня. Тут зала для продажу прадукцыі ў розніцу насельніцтву і кухня, дзе пякуць булачкі, круасаны і смажанкі. У былым кандытарскім цэху Яўграфавы вырабляюць ужо хлеб і батоны.

— Паверце: выпячы каравай, круасаны ці булачкі лягчэй, чым бохан хлеба. Таму што кожны градус у печы, кожная хвіліна маюць значэнне. Аднак мы з самага пачатку рыхтаваліся да цяжкасцяў. Кіраваліся толькі ДАСТам. Хлебныя «цаглінкі» выпускаюць усе «хлебпрамы» краіны, але менавіта першапачатковай рэцэптуры прытрымліваюцца нямногія. На працэс вытворчасці нашага хлеба ідзе шэсць гадзін. Гэта нецікава буйным заводам. Хто будзе тлуміць галаву дзеля партыі хлеба на такі час? Мы будзем!



Мука першага гатунку, мука абдзірная, соль, дрожджы, закваска. Ніякіх дадаткаў-паляпшальнікаў. У гэтым і складанасць.

Цяпер працуюць толькі ў начную змену. Але ўжо пашыраюць вытворчую лінію, плануюць вось-вось перайсці на кругласутачны рэжым. Пакуль вырабляюць паўтары тысячы адзінак прадукцыі за ноч. Усё строга пад заказ.

— Для нас ад пачатку прынцыповым заставаўся гэты момант: мы не перавырабляем хлеб. На пачатковым этапе партыі хлеба спісвалі па розных прычынах. Яго высушвалі і прадавалі па іншай цане як хлеб для хатняй жывёлы. Людзі пытаюцца: калі будзеце зноў прадаваць сухары? Мы спадзяёмся, што ніколі не будзе лішкаў хлеба, які не пройдзе кантроль.

Маладыя лоеўскія прадпрымальнікі пастаўляюць сваю прадукцыю ва ўсе прыватныя крамы райцэнтра і большую частку магазінаў па вёсках. Спадабаўся лоеўскі хлеб і жыхарам украінскіх пасёлкаў, што знаходзяцца ў памежжы.

— Мы пастаўляем свае вырабы 20 аптавікам. Плюс наша кавярня-пякарня — гэта ўласны гандлёвы пункт, які размяшчаецца ў той частцы Лоева, што толькі расце і пашыраецца. Па праўдзе кажучы, для маладой справы арэнда там вельмі высокая. Аднак мы патрэбныя людзям. Гэта такі «колсэрвіс». Нашы пакупнікі прыходзяць да нас штодзень, расказваюць, што хацелі б мець на сваім стале.

Справе дзевяць месяцаў, аднак ужо на сёння сямейны бізнес адкрыў 15 рабочых месцаў. У найбліжэйшы час будуць пашырацца.

— Спачатку людзі марылі пра смачны і натуральны хлеб. Цяпер жадаюць гарачую выпечку пастаянна. Раніцай будзем прадаваць спечанае ноччу, а на працягу дня яшчэ развозіць гарачы хлеб і батоны.

Яўграфавы таксама прынцыпова вырашылі: іх маленькі бізнес не будзе спаборнічаць ці канкурыраваць з прадукцыяй сеткавікоў ці буйных хлебпрамаў. Хай іх пакупнікоў будзе не так шмат, але гэта будуць «тыя самыя людзі».

— Не патрэбная этыкетка — ты разумееш па выглядзе і смаку, што хлеб наш той самы! Ведаеце, калі я гэта зразумела? Дапамагала неяк дзяўчатам за прылаўкам — адпускала нашу «цаглінку» такому самавітаму, вельмі сур'ёзнаму мужчыну, за пяцьдзясят гадоў. Узяў у рукі бохан, а ён гарачы. Мужчына ператварыўся ў дзіця. Скібку адламаў і папрасіў яшчэ адзін — маўляў, з'есць па дарозе, баіцца, не данясе дадому. Мы таксама баімся!

Зараз усе зароблены грошы пасля аплаты камунальных, арэндных рахункаў і выплаты зарплаты свайму калектыву прадпрымальнікі ўкладваюць у набыццё новага абсталявання.

— Мы хочам усё максімальна механізаваць — не для таго, каб скараціць нашых людзей. Проста ў нас зараз цалкам ручная вытворчасць. Толькі хлеба за змену 500 боханаў пекар уручную выпякае. Гэта тытанічны аб'ём работы.

Вольга шчыра кажа, што тут, у глыбінцы, нельга зайздросціць пякарням, якія пазіцыянуюць сябе як вытворцаў аўтэнтычнага хлеба:

> Выпячы каравай, круасаны ці булачкі лягчэй, чым бохан хлеба.

— Цэннік там на хлеб ад 3 рублёў за 300 грамаў. У нас няма выйсця, наш хлеб павінен быць канкурэнтаздольны. Не можам сабе дазволіць падымаць цану, трымаем яе на ўзроўні хлебпрамаўскіх вырабаў. Тыя маладыя самазанятыя, хто цікавіцца нашай гісторыяй і натхняецца прыкладам, павінны разумець, што якасны натуральны хлеб — выпрабаванне яшчэ і ў плане закупкі сыравіны. Мясцовая хлебная ініцыятыва не можа цягацца з тытанамі хлебнай вытворчасці.

Аднак дома, на Лоеўшчыне, упэўнена Вольга, мясцовыя чакаюць іх хлеба, таму нельга адступаць і здавацца.

— Я веру, што невялікі «бізнес з душой» — будучыня для малых гарадоў. У нас не проста вытворчасць, у нас сям'я, дзе пекары шчыра плачуць, калі бохан не падняўся як трэба. Мы рэальна жывём агульнай справай.

Не так даўно лоеўскія хлебапёкі адзначылі сваю першую маленькую перамогу — паўгода актыўнай дзейнасці. Не чакалі, але ў гэты ж самы час на Дзень горада ад кіраўніцтва Лоеўскага райвыканкама атрымалі падзячны ліст за ўнёсак у развіццё райцэнтра і актыўную жыццёвую пазіцыю. Яўграфавы мяркуюць, што гэта не проста папера з прыемнымі словамі, бо ўжо ёсць героі новых гісторый, якія жадаюць застацца ў Лоеве і адкрыць на радзіме сваю ўласную справу.

**Наталля НЕВЯРОЎСКАЯ.**

КОНКУРС

# ВЕРЫЦЬ У СЯБЕ

## Найлепшыя вытворцы краіны атрымалі прэмію «Лідар спажывецкага рынку»

Сярод лаўрэатаў вядучыя прадпрыемствы ў розных сегментах рынка — вытворчасць прадуктаў харчавання («Камунарка», агракамбінат «Дзяржынскі», «Баранавіцкі малочны камбінат», Глыбоцкі, Гродзенскі мясакамбінаты і іншыя), лёгкая прамысловасць, гандаль, будаўніцтва, дрэваапрацоўка, сродкі масавай інфармацыі, турызм (санаторыі «Сасновы бор», «Ружанскі»), рэклама, грамадскае харчаванне. Узнагароду атрымалі прадпрыемствы, якія вызначыліся нестандартнымі маркетынгавымі ходамі, дакладным веданнем запытаў спажыўцоў, здольнасцю бачыць новыя вектары развіцця.

Сёлета прэмію ўручылі ўжо пяты раз. Арганізатарам мерапрыемства выступіла Асацыяцыя малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Па словах прадстаўнікоў аргкамітэта, «Лідар спажывецкага рынка» — гэта эфектыўны інструмент прасоўвання айчыннай прадукцыі.

«Я хацеў бы падзякаваць усім, хто сабраўся, перш за ўсё прадпрымальнікам, кіраўнікам прадпрыемстваў, дзелавым людзям, уладальнікам кампаній, за іх унёсак у эканоміку краіны, за іх цяжкую, штодзённую працу, — сказаў **кіраўнік Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Сяргей БАЛЫКІН.** — Сёння мы адзначаем юбілей, добры юбілей. Нам пяць гадоў. Пяць гадоў для чалавека — гэта, можа, узрост немаўляці, але для пэўных кампаній — гэта сур'ёзны ўзрост. Узрост устойлівасці, пераходу ў новую якасць. Калі мы праіснавалі пяць гадоў, — значыць, мы адбыліся і замацаваліся на рынку».

Таксама ў рамках цырымоніі ўручана бізнес-прэмія «Лідар-2019» для кіраўнікоў і ўладальнікаў прадпрыемстваў.

Прэмія «Лідар спажывецкага рынку» была ўпершыню ўручана ў 2015 годзе. За гэты час яе лаўрэатамі стала больш за 100 самых паспяховых беларускіх прадпрыемстваў. Прызёры прэміі вызначаюцца экспертным саветам з прадстаўнікоў бізнес-супольнасці, органаў дзяржаўнай улады, медыя і навукі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ**

ОАО «Слуцкий льнозавод» сообщает, что 30 декабря 2019 года в 10.00 состоится внеочередное собрание акционеров.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

- увеличение уставного фонда Общества на сумму закрытой подписки;
- утверждение результатов закрытой подписки на акции;
- утверждение решения о дополнительном выпуске акций;
- внесение изменений в Устав Общества.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 20 декабря 2019 года.

Время регистрации участников — в день проведения собрания с 9.00 до 9.45 по адресу: ул. Ленина, 300.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

**Наблюдательный совет.**
УНН 690657228

**УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов** 20.01.2020 г. по продаже имущества, изъятого у Левицкого Д. Е.

Легковой седан «СААБ 9.5», 2005 г. в., начальной стоимостью 780 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

**Закрытое акционерное общество «ЮНИМИТ»** (222220, Республика Беларусь, Минская обл., Смолевичский район, Плисский сельсовет, 9/12 в районе поселка Октябрьский) сообщает, что директором ЗАО «ЮНИМИТ» 11.12.2019 принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется на 11.12.2019.

УНП690660279

## На хвалі

# ПАДАРУНКІ Ў ПРАМЫМ ЭФІРЫ

**Радыё «Мір» 25 снежня правядзе вялікі навагодні радыёмарафон у цэнтры сталіцы і перадасць прывітанні па ўсёй краіне.**

З 13 гадзін і да вечара ўвесь эфір радыё — ранішняе шоу «Пад'ёмная сіла», дзённы эфір «Ійлеева live», «Клёнавай вечар», «Высоцкай weekend» і «Стоп! Знята» — будзе весціся з выязной студыі, якая размесціцца ў ГЗЦ Palazzo. Варта адзначыць, што для здзяйснення прамога вяшчання на ўсю краіну тэхнічным спецыялістам радыёстанцыі давялося «кланіраваць» усё эфірнае абсталяванне.

— Гэтым летам мы ўжо пераносілі нашу студыю наўпрост на цэнтральную плошчу мікрараёна Новая Баравая і па рэакцыі прахожых зразумелі, што людзям цікава зазірнуць за кулісы радыё і пазнаёміцца з тымі, каго яны штодня чуюць у эфіры, — дзеліцца **галоўны дырэктар радыё «Мір» Аляксей АДАШКІН.** — Цяпер вырашылі зладзіць больш эмацыянальнае мерапрыемства. Так, 25 снежня з нашай выязной студыі кожную гадзіну будзе гучаць жывая музыка ў выкананні папулярных беларускіх артыстаў. Усе наведвальнікі гандлёвага цэнтра пабываюць на бясплатным канцэрце — гэта наш навагодні падарунак.

Што да спецыяльных гасцей, то ў студыю зазірнуць гурты NAVIBAND, NIZKIZ, Parade of Planets, Без Білета, Лера Яскевіч, Alen HIT і Дзядзька Ваня. Слухачы і гледачы радыёмарафона пачуюць навагоднія гісторыі ад зорных удзельнікаў і пачуюць іх выступленні. Таксама мінчане і госці сталіцы змогуць у прамым эфіры перадаваць прывітанні і віншаванні.

**Алена ДРАПКО.**

## Убачыць гісторыю

# ЧАС І ПРАСТОРУ СПАЛУЧАЦЬ У МІРСКІМ ЗАМКУ

20 снежня ў музеі замкавага комплексу «Мір» возьме старт міжнародны выставачны праект «Аб'ядноўваючы прастору і час», на якім будуць прадстаўлены ўнікальныя гістарычныя карты XVI—XVIII стагоддзяў, дзе адлюстраваны беларускія землі таго часу. Праект стаў вынікам супрацоўніцтва музея Мірскага замка, Нацыянальнага музея старых картаў і кніг (Румынія), гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі, цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі і калекцыянера, дызайнера ды рэстаўратара Ігара Сурмачэўскага.

На выстаўцы, расказалі «Звяздзе» ў аддзеле ўліку і захавання фондаў музея замкавага комплексу ў Міры, сабраныя рэдкія гістарычныя дакументы і іх копіі: карты работы славутых галандскіх, французскіх і нямецкіх майстроў Пітэра Шэнка, Міціаса Шутэра, Нікаля Сансона, Петруса Берціуса ды іншых. Як змяняліся з часам межы навакольных дзяржаў, куды рухаліся тыя ці іншыя ваенныя паходы і дзе ў выніку заключаліся мірныя дамовы, як наогул пашыраліся геаграфічныя веды — адказы на ўсе гэтыя пытанні можна атрымаць з дапамогай картаў.

«Асаблівай увагі заслугоўвае карта Вялікага Княства Літоўскага 1631—1650 гадоў, якая на працягу наступных двух стагоддзяў заставалася недасягальным узорам на тэрыторыі Рэчы Паспалітай — як па ўзроўні афармлення, так і па аб'ёме інфармацыі, змешчанай на ёй, — анансуюць адну з цікавінак экспазіцыі супрацоўнікі музея. — Гэту карту, якая цяпер захоўваецца ў фондах нашага музея, стварыў вядомы гравёр Томаш Макоўскі на замову князя Мікалая Хрыстафора Радзівіла Сіроткі. Дарэчы, партрэт самога фундатара можна будзе таксама ўбачыць на выстаўцы — на старонках кнігі «Перэгрынацыя, альбо Паломніцтва князя Мікалая Хрыстафора Радзівіла ў Святую Зямлю», датаванай 1683 годам».

Выстаўка працягне сваю работу да канца сакавіка 2020 года, а трапіць на яе можа кожны наведвальнік музея замкавага комплексу «Мір» — па квітку ў музей.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# ШАШКІ

**(«Звязда») Выпуск № 103**

29—30 лістапада ў Нетаніі (Ізраіль) адбыўся чэмпіянат Еўропы па шашках-100 у хуткай і маланкавай праграмах сярод мужчын і жанчын. Міжнародны гросмайстар Вольга Федаровіч стала сярэбраным прызёрам у рапідзе сярод жанчын. Крыху раней там жа адбыўся этап Кубка свету па шашках-100 Israel Open. Вольга Федаровіч стала найлепшай у заліку сярод жанчын, яе сястра Дар'я — на другім месцы.

Нашым чытачам спадабалася рашаць кампазіцыі майстра з Латвіі Генадзя Андрэева. Сёння прапануецца яшчэ некалькі яго пазіцый.

№ 84



Белыя простыя шашкі: c1, c5, e5, b6, d6, c7 (6)

Чорныя простыя шашкі: b2, a3, c3, g3, b4, a5, g5 (7)

№ 85

Белыя простыя шашкі: e5, b6, d6, h6, c7, e7 (6)

Чорныя простыя шашкі: f2, e3, g3, f4, h4, a5, g7, f8 (8)

№ 86

Белыя простыя шашкі: b4, f4, a5, c5, e5, g5, e7 (7)

Чорныя простыя шашкі: b2, d2, c3, h6, a7, c7, g7 (7)

Ялічэ дзве кампазіцыі ў бразільскіх шашках складзены вядучым аддзела.

№ 87

Белыя простыя шашкі: g1, d2, f2, h2, a3, e3 (6)

Чорныя простыя шашкі: c3, b4, h4, c5, e5 (5)

№ 88

Белыя простыя шашкі: e1, g1, b2, d2, h2, c3, f4, h4 (8)

Чорныя простыя шашкі: a3, a5, c7, g7, d8, f8, h8 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Анонс: 22 снежня ў Мінску (вул. Жукоўскага, 9) адбудзецца турнір па шашках-64 сярод ветэранаў. Пачатак у 12.00.

Арганізатары — А. С. Меленец і РГА «Ветэраны фізічнай культуры і спорту». Тэлефон аргкамітэта: 8-029-916-93-60.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 102 ад 06.12.2019.

№ 82 1. e3-f4 g3:c7 2. e7-f8 a3:c5 3. f8:b8+

№ 83 1. e5-d6 a3:g5 2. h4:h8 c7:e5 3. h8:g1+

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Бурко (Орша), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# СВЯТЫ НА ПАРОЗЕ



**Да Новага года ўсе рыхтуюцца загадзя: упрыгожваюць ялінку, выбіраюць доўгачаканыя падарункі. Вось і на каналах Белтэлерадыёкампаніі ўжо на наступным тыдні з'явяцца святочныя лагатыпы, а папулярныя праекты пачнуць выходзіць у навагоднім афармленні і прапануюць гледачам канцэрты, эксклюзіўныя трансляцыі, любімыя фільмы і гучныя прэм'еры.**

### Уключыць Дзеда Мароза...

У інфармацыйных праграмах на «першай кнопцы» журналісты Агенцтва тэленавін раскажуць, як рыхтуюцца да Каляд і Новага года ў розных гарадах нашай краіны і ўсяго свету. У «Панараме» з 25 снежня ў спецыяльнай навагодняй рубрыцы гледачоў чакаюць віншаванні ад Дзядуляў Марозаў з Нідэрландаў, Казахстана, Фінляндыі і нават з Маямі. Не абыдзецца, вядома, без пажаданняў да свят і ад расійскага чараўніка з Вялікага Усцюга і нашага Дзеда Мароза з Белавежскай пушчы. Таксама ў зімовай серыі відэаролікаў «Час навін» вы зможаце даведацца, што ён глядзіць у сваёй казачнай рэзідэнцыі.

Напярэдадні Раства Хрыстовага, якое каталікі ўсяго свету адзначаюць 25 снежня, «Беларусь 1» пакажа святочнае богаслужэнне з касцёла Божай Маці Фоцімскай у горадзе Жодзіна. Прамая трансляцыя пачнецца 24 снежня ў 21.45. А ў 23.45 беларускіх вернікаў чакае прамое ўключэнне з Ватыкана, дзе адбудзецца служба з удзелам Папы Рымскага Францыска.

### Аформіць падарункі...

Сямейны тэлеканал таксама рыхтуецца да навагодніх свят загадзя. Так, ужо з 23 снежня праект «Уключайся» пачне выходзіць у святочным афармленні. Карэспандэнты рыхтуюць рэпартажы з рэзідэнцыі беларускага Дзеда Мароза і здымкі рубрыкі «Навагодні стол». Пастаянныя рубрыкі «Стыль», «Б'юці», «Што да чаго?» таксама будуць тэматычныя: карысныя парады гледачам дадуць спецыялісты па святочным дэкоры, фларысты і афармленні падарункаў.

Падрыхтавалі спецыяльныя серыі да зімовых свят і стваральнікі праекта «Сямейныя гісторыі». Гледачы ўбачаць тры рэальныя гісторыі, якія маглі здарыцца толькі на Новы год. Першая серыя цыкла «Навараджы мне шчасце» выйдзе ў эфір 24 снежня ў 09.45 — гэта будзе гісторыя святкавання Новага года ў коле сяброў з прадказаннямі і цудамі.

У Раство канал «Беларусь 2» парадуе сваю аўдыторыю адмысловым кінапаказам выхаднога дня, у тым ліку прэм'ерай «Прыгажуня і пачвара» ў 18.45 і рамантычнай камедыяй «Прыгажуня на ўсю галаву» ў 21.15.

### ...І запрасіць да стала

Пераднавагоднія дні сацыякультурны канал Белтэлерадыёкампаніі прапануе правесці ў стылі рэтра: сярод кінафільмаў для ўсёй сям'і заяўлены «Прыгоды Бураціна», «Дзяўчына з характарам», «Чалавек з бульвара Капуцынаў» і шмат іншых. Тэматычныя выпускі праграмы «Беларуская кухня» раскажуць пра традыцыйныя святочныя стравы і раскрыюць тонкасці іх прыгатавання. А 25 снежня пачнецца з «Размовы пра духоўнае» ў 07.50, а ў 16.35 «Беларусь 3» пакажа трансляцыю з Ватыкана пасланні і благаслаўлення «Граду і свету» з удзелам Папы Рымскага Францыска, далей у эфір выйдуць «Культурны рэпартаж» і канцэрт акадэмічнага хору Сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі «Раство вакол нас».

**Алена ДРАПКО.**

**Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.**


## Сяброў у новым годзе не мяняюць!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на І квартал або І паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка рэкламнай гульні «Звязда» саграве!», выразайце і дасылайце яе да 12 студзеня 2020-га ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013.

**Сярод падпісчыкаў 17 студзеня 2020 года будуць разыграны сем двухбаковых пледаў з лагатыпам «Звязды» і суперпрыз — КАВАВАРКА эспрэса Vitek.** Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 27 студзеня 2020 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2020 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або І паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак — (017) 263 66 73.**

Правілы рэкламнай гульні чытайце ў нумары «Звязды» за 30 лістапада.

Тэрмін правядзення гульні — з 1 снежня 2019 года да 31 сакавіка 2020 года.



Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3694 ад 26.11.2019, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або І паўгоддзе 2020 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на І квартал або І паўгоддзе 2020 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.25** Існасць.
**6.50 Камедыя «Ёлкі-5» (6+).**
**8.20** Кулінарная дыпламатыя (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Маршрут пабудаваны (12+).
**9.45** Здароўе (12+).
**10.35** Старое — новае (12+).
**11.10, 12.10 Меладрама «Тры ў адным-3». (16+).**
**13.15 Меладрама «Тры ў адным-4». (16+).**
**15.15** Краіна.
**15.45** «Кухня жыцця» (12+).
**16.20 Меладрама «Ад кахання да нянавісці». 1—4-я серыі (16+).**
**20.00** «Макаёнка, 9».
**21.00** Панарама.
**21.45 Меладрама «Каўчэг Марка». (16+).**
**1.10** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** Анімацыйны фільм «Сакрэтная служба Санта Клауса» (0+).
**8.45, 20.55** Тэлебарометр.
**8.55 Фільм-казка «Спячая прыгажуня» (6+).**
**10.25** Хто я? (12+)
**10.45** Капейка ў капейку (12+).
**11.25** Камень, нажніцы, папера (16+).
**12.05** «Подыум» (12+).
**13.10** Анімацыйны фільм «Халоднае сэрца» (0+).
**14.50 Фэнтэзі «Прыгажуня і пачвара» (12+).**
**17.05** BELBET. Час перамог!
**17.15** «Каханне на выжыванне» (16+).
**18.55 Камедыя «Красуня на ўсю галаву» (16+).**
**21.00** Біятлон. Калядная гонка легенд-2019. У перапынку: Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.50** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**22.55 Фантастыка «Чалавек-мурашка» (12+).**

## Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 13.35, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 13.50, 20.35** «Гэты дзень».
**8.25** «Вoйка ў Трыдзевятым царстве». М/ф (0+).
**8.45** «Кухарка». Камедыя (12+).
**10.00** «Жывая культура». Традыцыя выпечкі каравая на Слонімшчыне. Каляндарна-абрадавае печыва (Гродзенская вобласць).
**10.20** «Беларуская кухня». Галубцы ў чапцы.
**10.50** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**11.20** «Чыстае неба». Драма (12+).
**13.05** «Навукаманія» (6+).
**13.55 «Ты — мне, я — табе». Камедыя (12+) [СЦ].**
**15.20** Госці «Славянскага базару — 2019». Канцэрт.
**16.15 «Усё, што нам трэба...» Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**20.00** «Суразмоўцы».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** Жорж Бізэ. «Кармэн». Опера Нацыянальнага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Беларусі.
**23.35** «Культурны рэпартаж». Батлейка.

## Беларусь 5

**7.00** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Славакія — Казахстан.
**8.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вулверхэмптан» — «Манчэстэр Сіці».
**10.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**11.40** Фактар сілы.
**12.10** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Германія — ЗША.
**14.05** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**14.35** Трэніровачны дзень.
**15.05** Вялікі спорт.
**15.50** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — ЦСКА (Масква).
**17.40** Азбука спорту.
**17.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ньюкасл» — «Эвертан». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**19.55** «Вось гэта спорт!»
**20.05** Біятлон. «Калядная гонка легенд — 2019». Гельзэнкірхен.
**21.00** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Расія — Канада. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**23.25** Спорт-цэнтр.
**23.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Бернлі» — «Манчэстэр Юнайтэд». 2-і тайм.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ] Нашы навіны.
**7.10** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**7.50** «Міхаіл Баярскі. «Шмат гадоў я не сплю па начах» (12+).
**9.10** «Міхаіл Баярскі. Адзін на ўсіх» (16+).
**12.20 Серыял «Клянуся кахаць цябе вечна» (16+).**
**16.20** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+)
**17.45** «Талент краіны» (6+).
**20.00** «Нашы навіны». Суботні выпуск.
**20.45** «Метэагід».
**21.10** «Спецыяльны рэпартаж» (16+).
**21.30** «Голас» (12+).
**23.30** «Дыскатэка 80-х» (16+).

## СТБ

**6.10** «Ежа багоў» (16+).
**7.55** «Анфас».
**8.15** «Самая карысная праграма» (16+).
**9.00** «Тайны Беларусі» (16+).
**10.00** «Мінск і мінчане».
**10.35** «Цэнтральны рэгіён».
**11.10, 20.05** Дакументальны праект (16+).
**11.40, 13.40, 16.40** «Джокер». Серыял (16+).
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.55** «СТБ-спорт».
**22.25** «Засакрэчаныя спісы» (16+).
**0.00 «NEXT-3». Серыял (16+).**

## МІР

**6.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.10** «Саюзнікі» (12+).
**6.40** «Такія розныя» (16+).
**7.20** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**7.50, 5.05** М/ф (6+).
**8.50** «Вой, мамачкі» (16+).
**9.25** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Як у рэстаране» (12+).
**10.50 Маст. фільм «Агонь, вада і медныя трубы» (6+).**
**12.35 Маст. фільм «Фініст — Ясны сокал» (12+).**
**14.10, 16.15 Маст. фільм «Пакроўскія вароты» (0+).**
**17.15 Маст. фільм «Тарыф «Навагодні» (16+).**
**19.15 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры» (0+).**
**0.40 Маст. фільм «Навагодні дэтэктыў» (12+).**
**2.25 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота» (12+).**
**3.40 Маст. фільм «Мы з джаза» (0+).**

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Я не вярнуся» (12+).**
**9.10 Маст. фільм «Узрост кахання» (12+).**
**11.00** Весткі.
**11.20** «Пяцёра на аднаго» (12+).
**12.15** «Наша справа» (16+).
**12.30** «Алюр».
**14.10** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт (16+).
**16.15 Маст. фільм «Мне з Вамі па дарозе» (12+).**
**19.45** «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Прывітанне, Андрэй!» (16+).
**22.40 Маст. фільм «Сіняе возера» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.25** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.55** «Цела чалавека» (16+).
**7.25** «Дача» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «НЗ.by: час вынікаў».
**8.50** «Гарады Беларусі» (6+).
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
**10.25** Галоўная дарога (16+).
**11.00** «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
**12.00** Кватэрнае пытанне (0+).
**13.05** «Паедзем, паядзім!» (0+)
**14.05 Маст. фільм «Моцная» (16+).**
**16.25** «Следства вялі...» (16+)
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.40 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).**
**0.30 Серыял «Версія» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 14.55, 18.50, 21.10, 1.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** М/ф «Кароль Леў».
**9.00 Камедыя «Падарунак на Каляды» (0+).**
**10.40** «Прызнайся, што смачна!»
**11.00 Баявік «Моцны арэшак. Свет пад пагрозай» (16+).**
**13.10 Фантастыка «Людзі ў чорным» (12+).**
**15.00** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Эліот».
**16.35 Меладрама «Сем'янін» (12+).**
**18.55** Мюзікл «Mamma mia!» (16+)
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Камедыя «Прыгоды Падынгтана» (0+).**
**22.50 Фантастыка «Зорныя войны. Гісторыя» (16+).**



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Ералаш» (6+).
**7.45** М/ф «Качыныя гісторыі» (0+).
**8.15** «Лаві момант» (16+).
**9.10, 17.55, 23.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.35** Баявік «Небяспечныя пасажыры цягніка 123» (16+).



**12.45, 19.00** Серыял «Гатэль «Элеон» (16+).
**14.50, 1.30** Серыял «Дзяўчынкі не здаюцца» (16+).
**16.55** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**21.00** Камедыя «Аднакласнікі-2» (12+).
**0.00** Серыял «Аднойчы ў міліцыі» (16+).
**3.10** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Абрамцава.
**7.05** «Культурны адпачынак». Дак. серыял.
**7.35, 12.30, 21.00** «Сапраўдная вайна прастолаў». Дак. фільм [СЦ].
**8.25** «Легенды сусветнага кіно». Сяргей Герасімаў.
**8.55, 12.15, 17.15** Прыгожая планета.
**9.10, 21.50** «Людміла Гурчанка». Серыял [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.25** ХХ стагоддзе. «Горад вялікага лёсу». Дак. фільм.
**13.20** «Пад купалам цырка». Маст. фільм. 2-я серыя.
**14.30, 2.30** «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].
**15.10** Навіны. Падрабязна. Кнігі.
**15.25, 23.40** «Мастакі і мадэлі». Маст. фільм.
**17.30** Падзеі года. XV Музычны фестываль «Crescendo» Дзяніса Мацуева.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Успамінаючы Жарэса Алфёрава. «Лінія жыцця» [СЦ].
**22.35** Кіно пра кіно. «Сібірыяда». Чорнае золата эпохі сацрэалізму». Дак. фільм [СЦ].

## Настальгія

**6.00** Дак. фільм «Фільм пра фільм. Сцеражыся аўтамабіля» (16+).
**6.45** Дак. фільм «Дзве гадзіны з бардамі» (16+).
**8.35, 13.00, 14.45, 15.45, 17.00, 19.10, 20.25, 21.45, 23.00, 5.10** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**9.45** Маст. фільм «Мелодыя на два галасы» (16+).
**12.05** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Самвыдат». 2004 год (18+).
**13.15, 19.30** Фільм-спектакль «Далей — цішыня». 1978 год (16+).
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Асаблівасці нацыянальнай эліты». 2006 год (12+).
**0.00** Маст. фільм «Настаўнік» (12+).
**1.40** Маст. фільм «Людзі і манекены». 3-я серыя (12+).
**3.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**4.00** Па старонках праграмы «Вакол смеху». 1987 год (12+).

## EuroSport 1

**0.10** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**1.00, 5.00, 17.00, 22.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету (12+).
**3.00, 7.00** Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды» (6+).
**4.00** Снаўборд. Кубак свету (12+).
**8.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
**9.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс» (12+).
**10.30** Веласпорт. «Вуэльта» (12+).
**11.30** Стральба (6+).
**12.05** Плаванне. International Swimming League (6+).
**14.00** Тэніс. Australian Open (6+).
**15.00** Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
**16.00** Тэніс. US Open (6+).
**17.45** Аўтагонкі. WTCR (12+).
**18.45** Конны спорт. Кубак свету (6+).
**20.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету (6+).

## Кінакамедыя

**0.55** Пятніца (16+).
**2.25** Украдзі маю жонку (16+).
**4.15** Шчасця! Здароўя! (16+)
**5.40** Плэйбой пад прыкрыццём (18+).
**7.25** Джунглі клічуць! У пошуках Марсупілами (12+).
**9.25** Дзядуля лёгкіх паводзін (18+).
**11.25** Кухня ў Парыжы (16+).
**13.30** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**15.45** Скандынаўскі фарсаж (16+).
**17.35** Скандынаўскі фарсаж. Гонкі на лёдзе (16+).
**19.30** Раство (18+).
**21.25** Калядная ноч у Барселоне (18+).



**23.20** Выкідала (18+).

## ТБ3

**6.00** Дакументальная калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**6.15** М/ф (6+).
**7.10** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.40** «Доктар І...» (16+).
**8.10** «Залатая нявеста». Серыял (12+).
**9.50, 23.35** «Улегцы» (12+).
**10.20, 15.35, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.20, 18.40** «Сляпая» (16+).
**12.25, 19.50** «Варажбітка» (12+).
**13.30, 17.35, 3.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.30, 2.20** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.35, 4.05** «Знакі лёсу» (16+).
**21.00** «Падмані мяне». Серыял (16+).
**22.45** «90-я» (16+).
**0.05** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.50** «Ноэль». Драма (16+).

## ТБ1000

**6.10, 17.35** Робін Гуд: прынц злодзеяў (12+).
**9.00** Халк (16+).
**11.40** Бетховен-2 (12+).
**13.25** Вяселле найлепшага сябра (12+).
**15.20** Елізавета (16+).
**20.10** Легенды восені (16+).
**22.35** Неверагодны Халк (16+).
**0.40** Вячэра (18+).
**2.45** Разня (16+).
**4.00** Афера па-амерыканску (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.50** Каханне ў горадзе Анёлаў (16+).
**9.35** Чорная вада (16+).
**12.00** Сябры сяброў (16+).
**13.40, 19.00** Апостал (16+).
**15.30** Шэрая Шыйка (6+).
**15.55** Няўлоўныя: Бангкок (16+).
**17.25, 5.30** Востраў шанцавання (16+).
**20.50** Дзед Мароз заўсёды тэлефануе... тройчы! (16+)
**22.45** Цар (16+).
**1.15** Стацкі саветнік (16+).
**3.50** Няўлоўныя: джэкпот (16+).

## National Geographic

**6.00, 4.20** Панарама 360 (16+).
**7.30** Скануючы час (16+).
**9.00, 13.35, 20.30** Гісторыя Эміратаў (16+).
**9.45, 19.00, 22.05** Закінутыя гарады (16+).
**12.50** Ледзяная дарога (16+).
**14.20** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**15.05** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**16.40, 21.15** Мегаземлетрасенне (16+).
**17.30** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**18.15** Апошнія ўцекачы Пампеяў (16+).
**19.45** Аўта-SOS (16+).
**22.50** Паломніцтва за святой крайняй плошчу (16+).
**23.35** Космас: прастора і час (16+).
**0.20** Тайныя гісторыі (16+).
**1.10** Тайны Гроба Гасподняга (16+).
**2.00** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).

## Discovery

**8.00, 20.20, 1.50** Вострaў (16+).
**8.50, 14.50, 16.40, 22.10, 3.30** Махінатары (12+).
**9.40, 17.35, 4.15** Мяцежны гараж (12+).
**10.30, 15.45, 21.15, 5.45** Як гэта ўстроена? (12+)
**11.22, 23.05** Бітвы за кантэйнеры (12+).
**12.14, 0.55, 6.30** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**13.06** Гаражны рамонт (12+).
**18.30, 5.00** Бітва за нерухомасць (12+).
**19.25, 7.15** Што магло пайсці не так? (16+)
**0.00** Шалёнае раство (12+).
**2.40** Мільёны Пабла Эскабара (16+).

## Беларусь 1

**6.20** Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Раство Хрыстова.
**6.30 Камедыя «Завея» (16+).**
**8.10, 9.10, 12.10, 15.10 Меладрама «Чужыя родныя». (16+).**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**16.45 Меладрама «Іншы». 1—4-я серыі (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45 Меладрама «З мяне хопіць». 1—4-я серыі (16+).**
**1.15** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.05 Фільм-казка «Спячая прыгажуня» (6+).**
**8.35, 21.05** Тэлебарометр.
**8.45, 23.15 Фэнтэзі «Cirque du Soleil: казачны свет» (12+).**
**10.10 Меладрама «Напярэдадні Раства» (12+).**
**11.45** Анімацыйны фільм «Сакрэтная служба Санта Клауса» (0+).
**13.25** «Арол і рэшка. Спецвыпуск» (16+).
**14.30** «Подыум» (12+).
**15.35 Фэнтэзі «Чароўнае Раство» (12+).**



**17.10 Меладрама «Каралеўскае Раство» (12+).**
**18.50 Фэнтэзі «Прыгажуня і пачвара» (12+).**
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.15 Камедыя «Красуня на ўсю галаву» (16+).**

## Беларусь 3

**7.30, 13.05, 20.15** Навіны культуры.
**7.50** «Размовы пра духоўнае». Раство Хрыстова.
**8.00 «Прыгоды Бураціна». Фільм — дзецям (6+).**
**10.20** «Беларуская кухня». Банкуха.
**10.50 «Па сямейных абставінах». Меладрама (12+) [СЦ].**
**13.20, 20.35** «Гэты дзень».
**13.25** «Люди встречаются...» Навагодні канцэрт Алега Жукава.
**14.55, 22.05 «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў». Трагікамедыя (12+) [СЦ].**
**16.35** Пасланне і благаславенне «Граду і Свету» з удзелам Папы Рымскага Францыска. Трансляцыя з Ватыкана.
**17.20** «Культурны рэпартаж». Батлейка.
**17.35** «Раство вакол нас». Канцэрт хору і сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі.
**18.45 «Дзяўчына без адрасу». Камедыя (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** Гала-канцэрт лаўрэатаў Мінскага міжнароднага Калядnatnага конкурсу вакалістаў. Частка 2-я.

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Спорт-кадр.
**7.40** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Нёман» (Гродна).
**9.40** Козел пра футбол.
**10.00** Гульні «навырост».
**10.30** «Вось гэта спорт!»
**10.40** Мастацкая гімнастыка. Baby Cup.
**14.20** Хакей. КХЛ. «Куньлунь РС» (Пекін) — «Дынама-Мінск».
**17.00** Біятлон. Кубак свету. Ле Гран-Барнан. Гонкі пераследу. Мужчыны. Жанчыны.
**18.45** Агнявы рубеж.
**19.20** Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) — «Дынама» (Масква). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**22.00** Слэм-данк.
**22.30** Хакей. КХЛ. «Куньлунь РС» (Пекін) — «Дынама-Мінск».

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10 Маст. фільм «Жаданне» (16+).**
**9.10, 23.10 Маст. фільм «Памылкі кахання» (16+).**
**10.55 Меладрама «Жонка Шчірліца» (16+).**
**12.40 Серыял «Дом спячых прыгажунь» (12+).**
**16.20** «Каханне маё...» Канцэрт Іны Афанасьевай (12+).
**18.45** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.50** «Лепш за ўсіх!»
**20.55 Серыял «Нюхач» (16+).**
**0.55 Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд» (16+).**

## СТБ

**6.25** «Цэнтральны рэгіён».
**6.55** «Ежа багоў» (16+).
**8.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**11.40** «Невядомая гісторыя» (16+).
**12.35, 13.40, 16.40 «Джокер. Аперацыя «Капкан». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.55** «СТБ-спорт».
**20.05** Дакументальны спецпраект (16+).
**23.10** «Невядомая гісторыя» (16+).
**0.00** Канцэрт гурта «Сплин» «Ключ да шыфра» (16+).

## МІР

**6.00, 10.10 Серыял «Галіна» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.45** Навіны (бягучы радок).
**10.30 Маст. фільм «Мужчына ў маёй галаве» (16+).**
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 19.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.45** «Сусветныя гульні розуму» (0+).
**21.30 Маст. фільм «Навагодні дэтэктыў» (12+).**
**0.00** Дак. фільм «Апошнія дні Мікалае Чаўшэску. Праз 30 гадоў» (12+).
**0.35** «Сусветныя лэдзі. Міхалкова» (12+).
**1.00** «Трэці лішні» (16+).
**2.00** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**2.30** «Водпуск без пуцёўкі» (16+).
**3.05** Aerosmith Rocks Donington (16+).
**4.50** «Смак па кішэні» (16+).
**5.20** «Здароўе» (12+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**14.35 Маст. фільм «Я не вярнуся» (12+).**
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Тайны следства-19» (12+).**
**22.25** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Спорт-мікс.
**6.25** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**7.10** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**7.40** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**8.05, 10.20 Серыял «Кодэкс гонару» (16+).**
**11.05 Серыял «Сабачая работа» (16+).**
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00, 16.25 Серыял «Дудачка пацукалова» (16+).**
**18.30, 19.45 Серыял «Пёс» (16+).**
**21.15 Серыял «Востраў асуджаных» (16+).**
**23.15 Серыял «Версія» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.00, 18.05, 21.05, 1.45** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.10** Мультпарад. «Лэдзі і бадзяга».
**8.25 Камедыя «Інтуіцыя» (12+).**
**10.00, 18.50 Серыял «Дэтэктыў Кандзіс» (16+).**
**11.00 Камедыя «Адзін дома-2».**
**13.05, 19.45 Серыял «Містар Робат» (16+).**
**14.00 Серыял «Вялікая Імперыя» (12+).**
**15.05** «Гумарыкна».
**15.10** «Мультпарад». «Олаф. Халодная прыгода».
**16.20 Серыял «Агент Мак Гайвер» (16+).**
**17.15, 0.55 Серыял «Імперыя» (16+).**
**18.15** «Законы прывабнасці» (12+).
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Меладрама «Шлях дадому» (6+).**
**22.40 Меладрама «Рэальнае каханне» (16+).**



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Лаві момант» (16+).
**8.25** «Ералаш» (6+).
**8.50** М/ф «Качыныя гісторыі» (0+).
**9.15** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**9.50** Камедыя «Дурдом на колах» (12+).
**11.50** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**12.45, 19.00** Серыял «Гатэль «Элеон» (16+).
**14.45** М/ф «Чароўная кніга» (0+).
**15.00** «Наш рамонт» (16+).
**15.50** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**16.55** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**17.55, 0.25** «Уральскія пельмені» (16+).
**21.00** Камедыя «Таксі-2» (12+).
**22.45** Жахі «Госці» (16+).
**1.20** «Кіно ў дэталях» (16+).
**2.10** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**3.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.10** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква Траццякова.
**7.05** «Культурны адпачынак». Дак. серыял.
**7.35** «Сапраўдная вайна прастолаў». Дак. фільм [СЦ].
**8.25** «Легенды сусветнага кіно». Аляксандр Роу.
**8.55** Прыгожая планета.
**9.10** «Людміла Гурчанка». Серыял, заключная серыя [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.00** 85 гадоў артысту. ХХ стагоддзе. «Мікалай Слічэнка». Дак. фільм.
**12.10** «Мы — цыгане». Спектакль тэатра «Ромэн». Запіс 1986 года.
**13.35** Колер часу. Густаў Клімт. «Залатая Адэль».
**13.45** «Шумі гарадок». Маст. фільм.
**15.10, 23.30** «Скінь маму з цягніка». Маст. фільм.
**16.35** Раман у камяні. «Аўстрыя. Зальцбург. Палац Альтэнау». Дак. фільм.
**17.05** 80 гадоў Эмануілу Вітаргану. «Лінія жыцця» [СЦ].
**18.00** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**18.15** «Сям'я як сям'я (Карабавы сустракаюць Новы год)». Маст. фільм.
**19.45** Успамінаючы Эліну Быстрыцкую. «Лінія жыцця» [СЦ].
**20.40** Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя птушка».
**22.15** Юбілей Ларысы Латынінай. «Лінія жыцця» [СЦ].
**2.00** «Жывая прырода Кубы». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Тацццянай Візбар. 2007 год (12+).
**7.05** Тэлеспектакль «Мяцеліца». 1983 год (16+).
**8.10, 9.45, 11.00, 12.50, 15.45, 17.00, 19.10, 21.45, 23.00, 1.10, 2.30, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў». Валянцін Фалін. 2007 год (12+).
**13.00** Маст. фільм «Калі мне будзе 54 гады» (16+).
**14.30** «Аркестр Поля Марыя». Фільм-канцэрт. 1983 год (12+).
**14.50, 19.30** «Прэс-экспрэс». 1994 год (16+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1962-ы. 1-я частка. 2010 год (12+).
**19.40** «Музычная гавань Элеаноры Філінай» (16+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Асаблівасці нацыянальнай эліты». 2006 год (12+).
**1.30** Фільм-спектакль «Далей — цішыня». 2-я серыя. 1978 год (16+).

## EuroSport 1

**0.00** Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
**1.10** Веласпорт. «Тур дэ Франс» (12+).
**2.10** Веласпорт. «Вуэльта» (12+).
**3.10** Біятлон. Кубак свету (6+).
**5.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету (6+).
**7.00, 21.00, 23.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету (12+).
**8.30, 10.35, 17.40** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**10.00** Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды» (6+).
**12.00** Тэніс. Australian Open (6+).
**13.00** Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
**14.00** Тэніс. US Open (6+).
**15.05** Плаванне. International Swimming League (6+).
**17.00** Стральба (6+).
**19.00** Алімпійскія гульні. «Насуперак усяму» (6+).
**19.30** Алімпійскія гульні. Foul Play (6+).
**20.00** Алімпійскія гульні. «Зала славы». Лондан-2012 (6+).

## Кінакамедыя

**0.30** СуперБабровы (12+).
**2.20** Сямейнае абрабаванне (16+).
**4.05** Пятніца (16+).
**5.45** Аперацыя «Тушонка» (16+).
**7.50** Тутсі (16+).
**10.10** Кіраванне гневам (12+).
**12.05** Прыгоды Падынгтана (12+).
**13.50** Прыгоды Падынгтана-2 (6+).
**15.50** Вялікі тата (12+).
**17.35** Без пачуццяў (16+).
**19.30** Падмануць усіх (16+).
**21.20** Амелі (16+).
**23.40** Лаўка запасных (16+).

## ТБ3

**6.00** Дакументальная калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**7.00** М/ф (6+).
**8.35** «Заложніца». Серыял (12+).
**10.15, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.15, 18.30, 4.00** «Сляпая» (16+).
**12.20** «Варажбітка» (12+).
**13.30, 17.25** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.35** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.40** «Мой герой» (12+).
**16.30, 2.45** «Знакі лёсу» (16+).
**19.40** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**20.45, 1.55** «Гучныя справы» (16+).
**21.50** «Людзі ў чорным-2». Камедыя (12+).
**23.30** «Якія замёрзлі». Трылер (16+).
**1.10** «90-я» (16+).

## ТБ1000

**6.10, 14.15** Бетховен-2 (12+).
**7.55** Трыстан і Ізольда (12+).
**10.15** Мой хлопец — псіх (16+).
**12.25** К-9: сабачая работа (12+).
**15.50** Дзявяткі (16+).
**17.40** Халк (16+).



**20.10** Брыдкі я (12+).
**21.55** Пяты элемент (12+).
**0.10** Залаты век (16+).
**2.20** Паліцэйскі з дзіцячага садка (12+).
**4.15** Неверагодны Халк (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.15** Бой з ценем (16+).
**9.50** Эластыка (16+).
**11.35** Чорная вада (16+).
**13.45, 19.00** Апостал (16+).
**15.30** Шэрая Шыйка (6+).
**16.00** Каханне ў горадзе Анёлаў (16+).
**17.30, 5.30** Нерэальнае каханне (12+).
**20.50** Мамы-3 (12+).
**23.10** Бой с ценем-2: рэванш (16+).
**1.45** Цар (16+).
**4.05** Помню — не помню! (12+)

## National Geographic

**6.00** Навуковыя недарэчнасці (12+).
**8.00** Зона будаўніцтва (16+).
**8.50** Інстынкт выжывання (16+).
**9.35** Асушыць акіян (16+).
**11.15** Космас: прастора і час (16+).
**13.25** Варожая планета (16+).
**15.50** Закінутыя гарады (16+).
**18.15** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**19.45** Марс (16+).
**22.10, 0.05** 1989-ы. Год, які стварыў сучасны свет (16+).
**0.20, 5.15** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).

## Discovery

**8.00, 20.20, 1.50** Вострaў (16+).
**8.50, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.40, 17.35, 4.15** Мяцежныя гараж (12+).
**10.30, 15.45, 21.40, 5.45** Як гэта ўстроена? (12+)
**11.22, 23.05** Бітвы за кантэйнеры (12+).
**12.14, 0.55, 6.30** Як устроены Сусвет (12+).
**13.06** Мільёны Пабла Эскабара (16+).
**13.58** Шалёнае раство (12+).
**14.50, 3.30** Залатая ліхаманка (16+).
**18.30, 5.00** Бітва за нерухомасць (12+).
**19.25, 7.15** Што магло пайсці не так? (16+)
**21.15** Ручная работа (12+).
**0.00** Скульптуры са снегу (12+).
**2.40** Веру-не-веру (12+).

# ЯК БЕЛАРУСКАМУ СЛІМАКУ ТРАПІЦЬ У ЕЎРОПУ,

## пакуль жыхары нашай краіны вучацца культуры яго спажывання



**ШТОГОД жыхары еўрапейскіх краін спажываюць сотні тон слімакоў. Развядзенне гэтых малюскаў стала там прыбытковым бізнесам. Вырошчваюць слімакоў у Францыі, Італіі, Германіі, Маштабнае развядзенне іх пачалося ў Расіі, ва Украіне. У Беларусі пакуль справа знаходзіцца ў першапачатковай стадыі. Такім бізнесам займаюцца, напрыклад, фермеры з Карэліцкага раёна. І даволі паспяхова.**



**«Я гатовы пастаўляць сваю прадукцыю за мяжу, але не магу дачакацца неабходных дакументаў на вываз.**

Вырашыў разводзіць слімакоў і **прадпрымальнік з Нясвіжскага раёна Павел СТАНІСЛАЎЧЫК.** Каля пяці гадоў таму ён выкупіў будынак школы. Планаваў адкрыць бетонную вытворчасць, але не падумаў, што памяшканні знаходзяцца паблізу ад жылога дома, і па санітарных нормах яна забаронена. Таму і заняўся слімакамі. Калісьці Павел Віктаравіч купіў гэтых малюскаў на рынку ў Маскве, вырошчваў для сваіх патрэб на прысядзібным участку. У 2016 годзе ён зараў невялікі лапік зямлі, які ў далейшым пашырыў да 1600 квадратных метраў (тут можна вырошчваць да пяці тон слімакоў). Затым падрыхтаваў і другі ўчастак, дзе можна атрымліваць іх сем-восем тон.

А разводзіць фермер такі від слімакоў, як Helis Aspersa Muller. У народзе іх называюць малым шэрым слімаком.



— Нехта сказаў, што вырошчванне гэтых панцырных істот — работа для гультаёў. Сапраўды так?— пацікавілася ў суразмоўніка.

— Сёння я ўжо навучыўся даглядаць слімакоў, вось напачатку было нялёгка, бо не ведаў пра шмат якія нюансы. У нейкі момант яны пачалі гінуць — адсутнічала вентыляцыя, у цяпліцы стаяла спякота, якую яны не пераносяць. Да таго ж, дрэнна елі, марудна раслі. Прычына аказалася ў камбікорме буйнога памолу, недахопе мелу для ўмацавання панцыра... Усе неабходныя звесткі браў у інтэрнэце, пераймаў вопыт у іншых фермераў.

На ферме абсталяваны спецыяльныя загоны для слімакоў, агароджаныя сеткавым палатном, зверху праходзіць спецыяльная сістэма паліву, якая стварае вільготнасць да 90 працэнтаў. Такое асяроддзе аптымальнае для жыццядзейнасці панцырных. Акрамя таго, ёсць і кармушкі — доўгія сталы з дошак, куды насыпаецца камбікорм. Разам з тым жывёліны любяць моркву, капусту, яблыкі. Выпаўзаюць яны харчавацца бліжэй да поўначы, калі на вуліцы спадае тэмпература. Спажываюць і спецыяльную траву. Летась гаспадар засеяў поле алейнай рэдзькай, але яна вырастае высокая, і слімакам нязручна яе есці. Сёлета Павел Віктаравіч купіў для пробы сумесь насення: рэдзьку і кітайскую капусту, якая дае шырокі ліст, ды і зямля не так хутка высыхае пасля паліву.

— Траву сею ў сакавіку. У маі, як толькі тэмпература на вуліцы ноччу ўсталёўваецца не ніжэй за плюс пяць градусаў, выпускаю малькоў з цяпліцы ў загон, устанаўліваю для іх кармавыя сталы. З мая да верасня яны вырастаюць да палавой спеласці і дасягаюць кандыцыі. Збіраем іх, мыем вадой са шланга, каб мелі таварны выгляд, сушым у цяпліцы вентылятарам, запакоўваем у сеткі.

Гатовы тавар, як і рэпрадуктыўны, захоўваецца ў халадзільніку пры тэмпературы 3—5 градусаў цяпла. У такім асяроддзі слімакі ўпадаюць у анабіёз (спячку), шчыльна закрыўшы плёнкай адтуліну ў ракавіне і тым самым падтрымліваючы камфортны мікраклімат унутры. У такім стане яны могуць спаць да паўгода і... чакаць свайго спажывання.

Павел Станіслаўчык сёлета сабраў невялікі «ўраджай» малюскаў — тону. У планах — пашыраць вытворчасць. Аднак атрымаць прадукцыю толькі палова справы. Яе неабходна прадаць.

— Еўрапейцы адсочваюць рынак. І як толькі на ім з'яўляецца новы вытворца слімакоў, імкнуцца наладзіць з ім кантакты, — кажа Павел Віктаравіч. — У набыцці маёй прадукцыі зацікаўлены тры іспанскія і дзве італьянскія фірмы. Італьянцы купляюць слімакоў па больш высокай цане, але бяруць невялікую колькасць — да пяці тон. Палякі набываюць тавар у неабмежаванай колькасці, але дзеляць яго на класнасць. А гэта дадатковыя затраты на пераборку, сарціроўку. Я гатовы пастаўляць сваю прадукцыю за мяжу, але не магу дачакацца неабходных дакументаў на вываз. Звяртаўся з заявамі ў Дэпартамент ветэрынарнага і харчовага нагляду Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

Менавіта гэтая структура павінна накіраваць у бельгійскую арганізацыю «Трэсіс» дакументы, якія пацвярджаюць, што прадукцыя экалагічна чыстая, без радыенуклідаў, адпавядае санітарным нормам, каб там выдалі адпаведны сертыфікат, які дазваляе пастаўку слімакоў у краіны Еўрасаюза з тэрыторыі Беларусі. Такая ж працэдура прадугледжана для ўвозу ў Еўразійскі эканамічны саюз, у Расійскую Федэрацыю.

**Як стала вядома, Дэпартамент ветэрынарыі пераслаў заяву ў адпаведнае ўпраўленне Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама, дзе павінны стварыць камісію і выехаць на месца. Спадзяёмся, што фермер дачакаецца раданай весткі.**

— У мяне гатова браць слімакоў расійская кампанія «АзоўТрэйд», якая вырошчвае іх і перапрацоўвае. Але зноў жа, павінен быць дазвол на вываз ад расійскага боку. Да мяне прыязджала камісія, зрабіла заўвагі, — працягвае фермер. — Недахопы выправіў: уладкаваў месца для захоўвання інвентару, хімікатаў, рабочага адзення, набыў рукамыйнік, кантэйнер для смецця. Да гэтага часу чакаю паўторнага візіту і адпаведнага рашэння. Гэта стрымлівае развіццё вытворчасці — я ж не магу заваліць увесь халадзільнік слімакамі. Куды іх падзець? Без дакументаў няма сэнсу імі займацца. Гродзенская фірма «Мока» закупляе слімакоў для перапрацоўкі і пастаўляе ў буйныя гандлёвай сеткі, дзе кілаграм далікатэсаў каштуе 70 рублёў. Гэта зразумела, бо каб атрымаць паўфабрыкаты, трэба ўкласці яшчэ шмат працы, фінансаў. Я ж прапаноўваю слімакоў у жывым выглядзе па 10 рублёў за кілаграм. У будучым планую зменшыць кошт.

Вінаградны слімак абавязкова прысутнічае ў меню еўрапейскіх рэстаранаў. У яго мясе няма халестэрыну, а бялка больш, чым у курыных яйках. Акрамя таго, яно багатае на амінакіслоты, такія неабходныя нашаму арганізму. А муцын (слізь), выкарыстоўваецца ў касметалагічнай, фармацэўтычнай прамысловасці.

— У будучым мы таксама плануем атрымліваць гэтае біялагічнае рэчыва. На сённяшні дзень кампанія «Беліта-Вітэкс» зацікаўленая ў яго пакупцы, але працэс збірання мы прадумалі не да канца, каб усё было чыста і гігіенічна, з захаваннем санітарных нормаў. Гэта яшчэ наперадзе, — упэўнены Павел Віктаравіч. — Больш за тое, мы можам выпускаць нават белую ікру з яек слімакоў.

**«Гэта стрымлівае развіццё вытворчасці — я ж не магу заваліць увесь халадзільнік слімакамі.**

Павел Станіслаўчык здабыў рэцэпт яе засолкі і гатуе гэты далікатэс для сям'і, сяброў і блізкіх. Па яго словах, смак белай ікры нагадвае смак чорнай, але без спецыфічнага рыбнага паху.

А яшчэ фермер хоча адкрыць гастранамічны тур. З гэтай мэтай ён прыцягнуў на ўчастак вагон-бочку. У такіх у савецкі час жылі будаўнікі — першапраходцы Байкала-Амурскай магістралі. Тут ёсць кухня, санвузел, душ, каналізацыя, цалкам захаваны санітарныя нормы. У гэтым вагоне прадпрымальнік мяркуе гатаваць розныя стравы са слімакоў. Усё, як кажуць, на месцы, злавіў, прыгатаваў і з'еў яшчэ цёпленькія ў прыгожай альтанцы, якую Павел Віктаравіч плануе пабудаваць у яблыневым садзе, што захаваўся каля будынка. А тэрыторыю ўпрыгожыць старымі побытавымі рэчамі, якімі карысталіся нашы продкі.

У беларусаў пакуль няма культуры спажывання слімакоў. Аднак, як верыць мой суразмоўнік, з цягам часу яна з'явіцца. Неабходна прывучаць людзей да гэтага далікатэсу. Падчас кірмашу ў Нясвіжы ён запрасіў французскага кухара, які пераехаў на радзіму жонкі ў Віцебскую вобласць. Майстар прыгатаваў сальс — са смажанай вэнджанай грудзінкі, вострай сухой каўбасы і слімакоў, са спецыямі ды выпараным белым вінам. І людзям спадабалася гэтая страва. А француз паабяцаў, што правядзе майстар-клас для свайго калегі, які будзе «працаваць» на кухні са слімакамі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



ПРАЦОЎНЫЯ АДНОСІНЫ

# ЖЫЦЦЁВА ВАЖНАЕ ПЫТАННЕ

**Наколькі эфектыўна на Віцебшчыне выконваецца Дырэктыва № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны»? І ці робіцца ўсё магчымае, каб на рабоце не гінулі і не атрымлівалі траўмы? Гэтыя тэмы, канешне, вельмі актуальныя для большасці жыхароў краіны, абмяркоўваліся на нядаўнім пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама.**

У ім браў удзел і кіраўнік Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Андрэйчанка. І цікава было паслухаць яго аргументаваную крытыку, тым больш што ён доўгі час узначальваў аблвыканкам. Адпаведна, ведае многае аб праблемных прадпрыемствах і арганізацыях не толькі звонку...

Як канстатаваў **намеснік старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Аляксандр ХРЫСТАФОРАЎ,** сёлета за дзесяць месяцаў з-за так званых знешніх прычын на рабоце загінулі 19 чалавек. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года — на двое менш.

Пры гэтым, сёлета на чатыры выпадкі больш фактаў цяжкага траўміравання — 64.

І, на жаль, у асноўным прычыны гібелі, траўмаў — традыцыйныя: парушэнні працоўнай дысцыпліны, адпаведных інструкцый, неасцярога...

**Кіраўнік ніжняй палаты парламента Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** адзначыў, што паўночная вобласць, на жаль, на першым месцы па паказчыку тых, хто загінуў на вытворчасці з разліку на 100 тысяч чалавек.

Народны выбраннік заклікаў прысутных больш адказна адносіцца да пытанняў бяспекі. Дзеля гэтага 15 гадоў таму і была падпісана дырэктыва. Паводле яго слоў, калі рабочае месца годнае, прэстыжнае з пункту гледжання аплаты працы, і грошы выплачваюцца своечасова, людзі самі будуць трымацца за яго.

Асаблівую ўвагу сярод іншага па тэме стварэння сучасных рабочых месцаў і бяспечнай працы аддалі Аршанскаму раёну. Усё, што патрэбна мясцовай уладзе, было агучана: для ўстойлівага развіцця, стварэння новых вытворчасцяў, асабліва умоў для інвестараў — гэтае і многае іншае кіраўніком дзяржавы зроблена, нагадаў спікер парламента.

Не трэба лішні раз нагадваць, што жыццё — самае дарагое. Канешне, нельга казаць, што нічога не робіцца. У прыватнасці, сёлета каля 25 мільёнаў рублёў выдаткавана, каб палепшыць умовы на рабочых месцах, небяспечных для здароўя. У выніку лягчэй стала працаваць прыкладна 1,3 тысячы чалавек.

А працоўныя высокакваліфікаваныя рэсурсы штогод прыбаўляюць у цане — гэта сусветны трэнд.

**Першы намеснік старшыні аблвыканкама Алег МАЦКЕВІЧ** прывёў рэальныя прыклады тых парушэнняў тэхнікі бяспекі, што сам бачыў падчас наведвання буйнога прадпрыемства.

Дык колькі ж іх увогуле ў вобласці? Дзясяткі, сотні!? Алег Мацкевіч таксама патрабаваў больш актыўна займацца прафілактыкай магчымых здарэнняў. І неабходна жорстка пытаць з тых кіраўнікоў, якія допусцілі гібель, траўматызм.

Між іншым, амаль з паўсотняй адказных асоб не працягнулі кантракты менавіта з-за таго, што яны не забяспечвалі працоўную дысцыпліну. Больш за 1,1 тысячы наймальнікаў, кіраўнікоў, спецыялістаў за парушэнні патрабаванняў аб ахове працы заплацілі штрафы: на агульную суму больш за 175 тысяч рублёў.

Вельмі пільна трэба вывучыць умовы працы ў сельскай мясцовасці. Уладзімір Андрэйчанка нагадаў пра нядаўняе пасяджэнне ў абласным цэнтры з удзелам Прэзідэнта краіны наконт перспектыўнага развіцця сельскай гаспадаркі Віцебшчыны. І адна з задач — стварыць для вяскоўцаў адпаведныя патрабам часу рабочыя месцы. І трэба рэкламаваць усе выгоды жыцця ў глыбінцы.

Між іншым, усё больш гараджан задумваюцца пра тое, каб пераехаць у правінцыю. І дзясяткі сем'яў на Віцебшчыне гэта робяць штогод.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Аб'екты без увагі?

## Уцягванне ў абарот пустуючых аб'ектаў ідзе марудна, канстатуюць у КДК Гродзенскай вобласці

**З пачатку года ўцягнута ў гаспадарчы абарот толькі 45 аб'ектаў з 209. А гэта ўсяго каля 20 %. Няма асаблівых вынікаў і па продажы будынкаў: са 195 аб'ектаў, якія выстаўляліся на аўкцыён, набылі гаспадароў толькі 36. Усяго чатыры перададзена ў карыстанне бязвыплатна.**

Амаль кожнае ведамства мае на сваім балансе такія пустуючыя будынкі. Удыхнуць у іх другое жыццё не заўсёды атрымліваецца. Многіх інвестараў палохае не толькі кошт, але і стан пабудоў, якія прастойваюць не адзін год. А ў выніку — план па ўцягванні ў эканамічны абарот аб'ектаў раённай і гарадской уласнасці выкананы толькі на 23 %.

У Камітэце дзяржкантролю лічаць, што мясцовыя ўлады не поўнасцю выкарыстоўваюць свае правы, у прыватнасці, магчымасць прадаваць аб'екты за адну базавую велічыню, а таксама перадаваць у бязвыплатнае карыстанне. А між тым такі кірунак толькі на карысць раёну, бо тут ствараюцца рабочыя месцы, папаўняецца бюджэт. Марудна ідзе гэта справа ў самых сельскагаспадарчых раёнах — Воранаўскім, Зэльвенскім і Дзятлаўскім. Тут сёлета не ўцягнуты ў гаспадарчы абарот ніводзін аб'ект.

Трэба сказаць, што ні адзін раён, таксама як і абласны цэнтр, не справіўся з планамі па продажы ці арэндзе пустуючых будынкаў. Напрыклад, у Слонімскім раёне ўцягнута толькі тры аб'екты з 28, у Шчучынскім адзін з 25, у Гродне — чатыры з 19. Найбольш удала спрацавалі ў Навагрудскім раёне, дзе ўдалося прыдбаць пяць будынкаў, але і гэта менш за палову ад намечанага.

Больш за ўсё нявыкарыстаных аб'ектаў знаходзіцца ва ўласнасці абласнога спажывецкага таварыства. На іх балансе каля 200 пустуючых будынкаў, плошча якіх складае 50 тысяч «квадратаў». А плошча зямельных участкаў, на якіх яны знаходзяцца, дасягае 112 гектараў. Пры гэтым арганізацыя нясе страты па іх утрыманні, расходы датычацца як нерухомасці, так і зямлі. У асноўным гэта былыя ўнівермагі, крамы, пункты грамадскага харчавання.

Падобныя факты назіраюцца і ў сацыяльнай сферы. Дэмаграфічная сітуацыя вымушае аптымізаваць работу адпаведных устаноў, асабліва гэта відаць у сельскай мясцовасці. Такім чынам, на сённяшні дзень у сферы адукацыі 46 пустуючых будынкаў, культуры — 23, аховы здароўя — 17. Усе яны падлягаюць продажу. Сярод аб'ектаў — дзіцячыя сады, школы, сельскія клубы, фельчарска-акушэрскія пункты, амбулаторыі. Некаторыя будынкі даволі старыя. Напрыклад, у вёсцы Раднікі Ваўкавыскага раёна быў клуб размяшчаўся ў будынку 1936 года пабудовы. А былая амбулаторыя ў Гальшанах знаходзілася ў памяшканнях комплекса, які пабудаваны ў 1937 годзе. Утрыманне такіх аб'ектаў патрабуе рамонту, значных сродкаў, а самі аб'екты з-за малой колькасці насельніцтва незапатрабаваныя.

У тэму

## Пераўтварэнне магчыма

### У фізкультурным будынку савецкіх часоў размясціўся сучасны спартыўны комплекс



Прыклады ўдалага, проста фантастычнага пераўтварэння старога будынка дэпутаты Гродзенскага абласнога Савета назіралі ў Шчучыне падчас выязной сесіі. Шчучын — горад з велізарнай ваеннай спадчынай. Тут месцілася нямала ваенных баз, у тым ліку авіяцыйная і ракетная. Значную частку аб'ектаў удалося задзейнічаць. Адзін з такіх прыкладаў — будынак былых вайскоўцаў, дзе яны займаліся фізічнай падрыхтоўкай. Пасля расфарміравання часці вялікі будынак доўгі час стаяў пусты, і, мяркуючы па фотаздымках, меў вельмі непрывабны выгляд. Дайшло да таго, што 15 гадоў таму ён быў законсерваваны з-за аварыйнага стану. І стаяў так яшчэ амаль 10 гадоў.

Сёння гэты аб'ект не пазнаць. Тут змянілася ўсё — і знешні выгляд, і «начынка». Як расказаў **загадчык сектара спорту і турызму Шчучынскага райвыканкама Іван ГНЯЗДОЎСКІ,** важную ролю адыгралі сяброўскія сувязі з суседзямі-літоўцамі.

Мясцовыя ўлады разам са сваімі партнёрамі з горада-пабраціма Варэны падалі заяўку на грант па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Літва—Латвія—Беларусь». У даволі жорсткай барацьбе выйгралі конкурс і атрымалі 630 тысяч еўра на аднаўленне аб'екта. Ён па-ранейшаму мае спартыўны ўхіл, але выглядае зусім інакш. Сучасная зала з мноствам трэнажораў, зала для спартыўных гульняў, абсталяваныя раздзявальні, душавыя, кабінеты трэнераў і адміністрацыі. Фасад набыў сучасны стыльны выгляд.

Новы комплекс цяпер знаходзіцца на балансе спартыўнай школы Шчучына. Дзякуючы рэканструкцыі створана каманда раёна па міні-футболе, якая бярэ ўдзел у чэмпіянаце Беларусі сярод камандаў вышэйшай лігі. Па словах супрацоўніка райвыканкама, праект прызнаны найлепшым спартыўным інфраструктурным праектам трансгранічнай праграмы. Цяпер гэтая работа працягваецца. У рамках еўрапейскай праграмы ў Шчучыне рэалізуецца яшчэ адзін інфраструктурны праект па рэканструкцыі школы мастацтваў, бюджэт якога 350 тысяч еўра. Што цікава, партнёрам беларускага горада стаў польскі Шчучын: гарады-цёзкі таксама з'яўляюцца пабрацімамі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# Калі фінансы спяваюць рамансы,

## або Чаму не ўсе наймальнікі своечасова разлічваюцца з работнікамі

**Прафсаюзы Міншчыны штомесяц вядуць маніторынг заработнай платы, яе ўзроўню, тэрмінаў і своечасовасці выплаты ў арганізацыях цэнтральнага рэгіёна. У адпаведнасці з Генеральным пагадненнем паміж урадам, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў яна павінна выплачвацца не радзей за два разы на месяц і не пазней 25-га чысла.**

— Пры наведванні пярвічных прафсаюзных арганізацый асаблівую ўвагу звяртаем на адпаведнасць калектыўных дагавораў Пагадненню. Калі выяўляем парушэнні, затрымкі заробку, даём наймальніку рэкамендацыі, просім прыняць захады да выпраўлення сітуацыі і больш не парушаць правы і законныя інтарэсы работнікаў, — кажа **загадчык аддзела сацыяльнага партнёрства і працоўных адносін Мінскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Аляксандр ЮРЧЫК.**

Вядома, фінансава-эканамічная сітуацыя на прадпрыемствах і ў арганізацыях розная, што ўплывае на своечасовасць разлікаў. Некаторыя наймальнікі пераносяць тэрміны выплаты, напрыклад, на 26, 27, 28-е чысло месяца. У гэтым выпадку прафсаюзы таксама даюць ім пісьмовую рэкамендацыю пра адпаведнасць нормам Генеральнага пагаднення. Гэтыя абавязацельствы прапісаныя і ў абласным, тарыфных пагадненнях галіновых прафсаюзаў, у калектыўных дагаворах арганізацый. Некаторыя, напрыклад, даюць адказ, што з аб'ектыўных прычын не могуць захаваць тэрміны выплаты заробку. У іх заключаны дагавор на аплату тавараў, паслуг з партнёрамі, з якімі яны павінны своечасова разлічыцца, каб пазбегнуць штрафных санкцый. «Мы зноў пісьмова рэкамендуем, што трэба мяняць падыходы, бо да 25-га чысла людзям неабходна аплаціць камунальныя паслугі, пры затрымцы ім налічваецца пеня. Арганізацыі ідуць нам на сустрач», — канстатуе Аляксандр Юрчык.

Але ёсць і такія выпадкі, што людзі спраўна ходзяць на работу, а зарплаты не бачаць. Сярод хранічных даўжнікоў — Барысаўскі крыштальны завод, закрытае акцыянернае таварыства «Аэрамаш» у Мінскім раёне, сумеснае прадпрыемства «Івкон» у Валожынскім раёне. «Раней на гэтых прадпрыемствах працавала больш за 500 чалавек, а гэта члены прафсаюза, якіх мы павінны абараняць. Наймальнік стараецца выплаціць зарплату па частках за кошт продажу маёмасці, шукае іншыя магчымасці, — адзначае мой суразмоўнік. — Мы як прафсаюзы павінны патрабаваць, каб з людзьмі разлічыліся цалкам, таму што пры выплаце зарплаты ўзносы ідуць у фонд сацыяльнай абароны. Калі наймальнік не ўносіць іх, то работнік страчвае не толькі даходы, але і страхавы стаж, які ў далейшым уплывае на памер пенсійных выплат».

Мінскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў цесна працуе з выканаўчай уладай, усе праблемныя пытанні, у тым ліку па выплаце зарплаты, выносяць на пасяджэнні Савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, куды ўваходзяць наймальнікі, Аграпрамысловы саюз Мінскай вобласці, Рэспубліканская асацыяцыя прадпрыемстваў прамысловасці.

— Некаторыя прадпрыемствы знаходзяцца ў рэспубліканскай падпарадкаванасці, але змяшчаюцца на тэрыторыі Мінскай вобласці, а іх работнікі — члены прафсаюза. І мы абавязаны дапамагаць людзям, — упэўнены Аляксандр Юрчык.

Летась у цяжкім становішчы апынуўся Маладзечанскі завод металаканструкцый, некаторы час тут не выплачвалася зарплата. У калектыў выязджала кіраўніцтва Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Мінскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў, працавалі разам з выканаўчай уладай, і пытанне вырашылася станоўча.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ПАЛЕСКАГА ЗАПАВЕДНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

У адселенай вёсцы Бабчын Хойніцкага раёна на кантрольна-прапускным пункце знак радыяцыйнай небяспекі відаць здалёк. Побач надпіс: «Уваход і ўезд ЗАБАРОНЕНЫ!».

Да чарнобыльскай катастрофы ў Бабчыне жылі 728 чалавек. Цяпер тут размяшчаецца цэнтр радыяцыйна-экалагічнага запаведніка — велізарнай тэрыторыі — 216,5 тысячы гектараў зямлі, пашкоджанай радыяцыяй.

Першапачаткова запаведнік стварaўся для таго, каб засцерагчы пакрытую радыенуклідамі тэрыторыю ад непажаданых наведванняў. У 1988 годзе на 142,8 тысячы гектараў забруджаных зямель Брагінскага, Хойніцкага і Нараўлянскага раёнаў, якія ўключаюць у сябе беларускі сектар 30-кіламетровай зоны Чарнобыльскай АЭС, быў арганізаваны Палескі дзяржаўны экалагічны запаведнік.

— З 2013 года мы атрымалі статус дзяржаўнай прыродаахоўнай навукова-даследчай установы, — расказвае дырэктар запаведніка Міхаіл Рубашчанка, — і цяпер вядзём шырокую гаспадарчую дзейнасць: пчалярства, конегадоўля, маем магчымасць рэалізацыі лесапрадукцыі.

***— Якая мэта стварэння такіх відаў дзейнасці на зямлі, што забруджана радыяцыяй?***

— Гэта эксперыментальныя кірункі. Многія з іх былі ўпершыню агучаны падчас візіту Прэзідэнта. Наша мэта — пагля-дзець, ці будуць яны развівацца на забруджаных тэрыторыях. Ці будзе ўвогуле жыццё тут? І наогул, наколькі гэтая дзейнасць эканамічна сябе апраўдвае? Бо пацярпелых ад радыяцыі тэрыторый у нас дастаткова ў Беларусі. На ўсе гэтыя пытанні мы павінны даць адказ. Думаю, што тыя рэкамендацыі, якія праз нейкі час агучаць нашы навукоўцы, будуць мець вялізную навуковую каштоўнасць і акажуць уплыў на развіццё такіх тэрыторый у цэлым па краіне.

***— Значыць, ваш запаведнік — гэта такая навукова-эксперыментальная пляцоўка дзяржаўнага значэння па вывучэнні ўплыву радыяцыі на навакольнае асяроддзе?***

— Так, правільна. Сёння мы маем магчымасць значна пашырыць кірункі нашых даследаванняў. Новае заканадаўства прадугледжвае развіццё новых відаў дзейнасці.

Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік складаецца з дзвюх зон. Першая зона — запаведная. Тут знаходзяцца трансуранавыя кампаненты, перыяд іх паўраспаду — сотні гадоў. На гэтай тэрыторыі дазволена арганізоўваць інфармацыйна-экалагічныя маршруты і праводзіць асветніцкія навукова-пазнавальныя і навучальныя экскурсіі. Таксама тут плануецца развіваць рыбалоўную гаспадарку на рацэ Прыпяць. На тэрыторыі эксперыментальна-гаспадарчай зоны пералік дазволеных раней відаў дзейнасці (у дадатак да дазволеных на тэрыторыі запаведнай зоны) дапоўнены новымі відамі дзейнасці. Тут плануецца развіваць пчалярства, конегадоўлю, турызм, пладаводства, гадавальнікаводства, займацца арганізацыяй і правядзеннем палявання.

— Эксперыментальна-гаспадарчая зона — гэта тэрыторыя, якая была перададзена нам у 1993 годзе ад Нараўлянскага, Хойніцкага і Брагінскага лясгасаў, — кажа Міхаіл Рубашчанка. — Калі раней у нас былі ў асноўным такія віды даследаванняў, як пчалярства, конегадоўля, то цяпер мы зможам займацца пладаводствам, рыбнай лоўляй і развіццём паляўніцтвазнаўчай гаспадаркі. Гэта зусім новыя віды дзейнасці, якіх раней не было.

Добра, што закон прыняты. Да гэтага заканадаўства не дазваляла працаваць па такіх кірунках. Мы перад сабой ставім задачу — і гэта галоўная навуковая мэта запаведніка — не толькі вывучыць уплыў радыяцыі на прыроднае асяроддзе, але і распрацаваць метады рэабілітацыі забруджаных радыенуклідамі тэрыторый. Для гэтага тут створаны эксперыментальныя пчальнік, сад.

***— Людзей заўсёды хвалюе пытанне бяспекі прадукцыі. У вас жа на тэрыторыі значна павышаны ўзровень радыяцыі?***

— Справа ў тым, што радыеактыўнае забруджванне на тэрыторыі запаведніка не суцэльнае, а мазаічнае. На чыстых тэрыторыях мы гадуем пчол. У гэтым кірунку ўжо вялікая работа праведзена. Мы прывозілі розныя віды пчол, старанна выбіралі найбольш прыдатныя для гадоўлі ў нашых умовах.

Што датычыцца бяспекі прадукцыі, то, паверце, з гэтым у нас вельмі строга. Створаны спецыяльны аддзел, працуюць дзве лабараторыі, якія займаюцца не толькі вывучэннем уплыву радыяцыі, але і строгім кантролем якасці прадукцыі, якую мы адпраўляем за межы запаведніка. Усё, што выбраляецца ў запаведніку, праходзіць праз лабараторыю і выпускаецца са знакам якасці.

Калі ўзяць дрэваапрацоўку, то перад тым, як секчы лес, мы правяраем яго на наяўнасць радыяцыі да высечкі, а затым яшчэ праводзім кантрольнае даследаванне, калі выпускаем абрэзную дошку або іншыя будматэрыялы.

***— Міхаіл Міхайлавіч, абноўлены закон прадугледжвае актыўнае развіццё турызму на тэрыторыі запаведнай зоны. Раскажыце больш падрабязна пра гэта.***

— Баюся гаварыць, каб не сурочыць *(смяецца)*. У нас ужо нешта крышку атрымліваецца. Я маю на ўвазе такі кірунак, як навукова-асветніцкія пазнавальныя экскурсіі. Мы імі пачалі займацца практычна з гэтага года і бачым, што ёсць попыт. Калі раней наша ахова затрымлівала шматлікіх сталкераў на тэрыторыі, цікаўных грамадзян, якія, нягледзячы на небяспеку, імкнуліся паглядзець, што і як там расце, дык цяпер пад кантролем нашых супрацоўнікаў кожны можна прыехаць і паглядзець той жывёльны і раслінны свет, які ёсць у нас. На самай справе гэта вельмі цікава. Такой тэрыторыі, як у нас, у радыяцыйна-экалагічным запаведніку няма практычна нідзе.

Вучоныя сцвярджаюць, што пасля забруджвання доўгажывучымі трансуранавымі радыенуклідамі тэрыторыя Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка не можа быць вернута ў гаспадарчае карыстанне ў агляднай будучыні. З цягам часу ўзрастае ўтрыманне ў глебе амерыцыю-241 — прадукту распаду плутонію. Яго перыяд паўраспаду — 432 гады. (На думку спецыялістаў, альфа-выпраменьвальнік амерыцый-241 нашмат больш таксічны за плутоній-241.) За 20 гадоў пасля аварыі адбылося двухразовае павелічэнне яго актыўнасці ў глебе. Гэта адзіны радыенуклід, канцэнтрацыя якога ў аб'ектах навакольнага асяроддзя будзе ўзрастаць прыблізна да 2060 года.

***— Пасля Чарнобыльскай катастрофы неяк не імкнуліся наведваць забруджаныя месцы. Радыяцыі баяліся. Зона адсялення была пустыннай тэрыторыяй. Як вы лічыце, чаму цяпер гэта стала выклікаць цікавасць у турыстаў?***

— Фільм «Чарнобыль» адыграў пэўную ролю. Значны ўсплёск цікавасці цяпер назіраем. За дзевяць месяцаў гэтага года праведзена каля 70 экскурсійных тураў. Запаведнік наведала 475 турыстаў, у тым ліку 313 замежных грамадзян. Выручка за студзень—верасень 2019 года склала 50,4 тысячы рублёў. Плануем штогод арганізоўваць 90—100 экскурсійных тураў. Пакуль на гэты напрамак ёсць попыт.

***— Якім вы бачыце ваш запаведнік у перспектыве, да чаго імкняцеся?***

— Сёння складана нешта прагназаваць. Вось заключылі дагавор з інстытутам пладаводства, завезлі новы від пчол. Будзем назіраць. Папаўняем нашу конскую ферму. А ў цэлым праблемы запаведніка — гэта праблемы звычайнага прадпрыемства, каб людзі зараблялі і нешта прыносілі дадому. А самае галоўнае — каб былі здаровыя.

***— А вы самі, працуючы ў заражанай зоне, ці не баіцеся радыяцыі?***

— Я нарадзіўся на гэтай зямлі, мая сям'я была адселена. Баяцца радыяцыі не трэба, але з ёй трэба лічыцца. Трэба ведаць, як сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі на заражанай тэрыторыі. Упэўнены, што дзякуючы нашай рабоце, даследаванням навукоўцаў мы дадзім людзям вельмі патрэбную падказку: як жыць, паўнавартасна працаваць і адраджаць нашу пацярпелую зямлю.

**Наталля БІТЭЛЬ.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении**

**27 января 2020 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 37,4 кв. м (33,7; 3,7)** в изолированном помещении – помещении связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 4-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1,0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2 | **158,02** | 15,80 |
| 2 | **Помещение площадью 20,7 кв. м**, в изолированном помещении – помещении связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 6-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1,0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2 | **87,46** | 8,75 |
| 3 | **Помещение площадью 25,0 кв. м**, в капитальном строении – здании отделении связи с инв. № 340/С–4428, помещение на 2-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 0,9. **Адрес:** г. Гомель, пр. Октября, 81 | **105,63** | 10,56 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8(0232)79-67-44 |
| **Срок подачи заявления** | **с 20.12.2019 г. по 23.01.2020 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». **Подача документов по почте не допускается.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, BIC AKBBBY21302, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Условия пользования** | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств). |
| **Размер штрафа** | Лот № 1 – 3 базовых величины; лот № 2 – 1 базовая величина; лот № 3 – 2 базовых величины согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от условий проведения аукционных торгов согласно действующему законодательству) |

**Срок договора аренды – 5(пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и представить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

НАТХНЕННЕ

# Іду па Маякоўскага, чытаю Багдановіча...

**У цэнтры Брэста з'явіліся паэтычныя муралы — на вуліцах Гогаля, Камсамольскай і Маякоўскага цяпер можна ўбачыць на сценах дамоў і прачытаць вершы Максіма Багдановіча, Генадзя Бураўкіна, Ніны Мацяш.**

Што цікава, аўтарам праекта выступіў школьнік. Дзевяцікласнік брэсцкай гімназіі № 1 Дзяніс Рабчук стварыў валанцёрскую ініцыятыву #vershybrest і падаў сваю ідэю на конкурс у межах Школы праектнага менеджара, якую ладзіць агенцтва рэгіянальнага развіцця «Дзедзіч».



Фота АРР «Дзедзіч».

Хлопец прызнаецца: ідэя ўпрыгожыць родны горад з'явілася амаль раптоўна, падчас шпацыру па Львове, дзе ўжо ёсць падобныя муралы. «Я падумаў і вырашыў: трэба дзейнічаць. Напісаў невялікі праект, падаў яго на конкурс у «Школе праектнага менеджара» і перамог у ім, атрымаў фінансаванне на маляванне трох вершаў, — расказвае аўтар праекта. — Таксама акцыю падтрымаў старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Рагачук, а ў выбары месцаў для малюнкаў і ў аператыўным выкананні неабходных адміністрацыйных працэдур вялікую дапамогу аказалі галоўны архітэктар Брэста Мікалай Уласюк і кіраўнік аддзела ідэалогіі Генадзь Іванчын». Рукапісныя радкі пры дапамозе праектара перанесла на сцены маладая мастачка Юлія Раманчук.

Неўзабаве, кажа Дзяніс, #vershybrest атрымае працяг — плануецца запусціць краўдфандынгавую кампанію па зборы сродкаў на ўпрыгожванне вершамі беларускіх класікаў іншых дамоў у цэнтры Брэста. Як спадзяюцца актывісты, у выніку атрымаецца не менш чым два дзясяткі вершаваных муралаў, прычым улюбёных аўтараў ужо зараз могуць прапанаваць як гараджане, так і турысты. Ідэі прымаюцца праз асабістыя паведамленні ў «Інстаграме» @vershy.brest, тут жа можна сачыць за ходам валанцёрскай ініцыятывы.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

ЗРОБЛЕНА З ДУШОЙ

# Летам — нарадзіўся, зімой — весяліўся

**70-гадовы юбілей адзначылі ў снежні працаўнікі сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Жухавічы», які лічыцца адным з лідараў Карэліцкага раёна. Тут ёсць поспехі і ў малочнай, і ў мясной, і ў раслiннай галінах. А буйны яблыневы сад ды дойка кароў пад музыку — «разыначкі» СВК, якія сведчаць пра руплівасць ды жаданне кіраўніцтва і людзей быць найлепшымі ў сваёй справе. І хоць 70 юбіляру споўнілася яшчэ ў ліпені, аднак як сапраўдны гаспадар СВК святкаваў ды гуляў толькі пасля таго, як перад зімой упарадкаваўся.**

Да раённых лістападаўскіх Дажынак і 70-га дня нараджэння гаспадарка рыхтавалася ўсё лета. У аграгарадку Жухавічы, які па колькасці жыхароў саступае толькі райцэнтру Карэлічы ды пасёлку Мір, — цалкам пераабсталявалі Дом культуры, упарадкавалі дарогу, зрабілі алею праццаўнікоў. На свята, дарэчы, запрасілі не толькі больш як 500 цяперашніх работнікаў, а і абсалютна ўсіх, хто калісьці шчыраваў у калгасе.

На гэтай зямлі добра ведаюць, што самыя лепшыя, прыгожыя ды карысныя справы робяцца толькі талакой. Ды і самі людзі старанна да свята рыхтаваліся — паабапал вуліцы то новыя агароджы, то перафарбаваныя, а некаторыя нават хаты нанова расфарбавалі.

— Усе стараліся да свята прыбрацца, бо ў адным жа доме жывём! А людзі ў нас старанныя, зычлівыя, без іх гаспадаркі не стала б адной з найлепшых у раёне і не дасягнула б такіх паказчыкаў, — кажа **старшыня Жухавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр ІВАШКА.** — Заасфальтавалі 300 метраў дарогі, памянялі кіламетр лініі электраперадачы, усталявалі энергазберагальныя свяцільнікі.

Удзельнікі свята кажуць, што юбілей атрымаўся душэўны. Кіраўнікі рабочых участкаў сабралі сваіх ветэранаў, каб да значнай даты далучыліся абсалютна ўсе.

Падарунак на юбілей атрымаў кожны. На добрую памяць усім працаўнікам гаспадаркі ўручылі камплект ручнікоў з вышыўкай, прысвечанай юбілею, па 50 рублёў і харчовы набор: 15 кіло цукру, па 10 мукі ды макароны. А пачэсным ветэранам, якія на свяце былі ва ўсіх сэнсах у першых радах, яшчэ і радыёгадзіннікі падарылі. Тым, хто не змог прысутнічаць на свяце, на наступны дзень гасцінцы развозілі па хатах. Вялізны каравай, які ўручылі старшыні СВК «Жухавічы», пасля падзялілі паміж усімі гасцямі, такім чынам кожнаму дастаўся яшчэ і ядомы кавалачак свята.

Праходзілі ўсе святы гаспадаркі ў абноўленым Доме культуры, якому налета споўніцца 50. За гэты час будынак не бачыў ніводнага рамонту, а тут літаральна за тры месяцы цалкам перайначыўся. Зроблены новы фасад, адрамантавана страха, аздоблены сцены ўнутры, адноўлены падлога і электраправодка. Глядацкая зала атрымала новыя крэслы, а творчы калектыў — цэлы «пасаг» з сучасных сцэнічных касцюмаў.

— У нас нават дываны пасцяліліі чырвоныя, як у высокіх кабінетах, — смяецца **Святлана АБЛАМЕЙКА, дырэктар Жухавіцкага Дома культуры.**

Да вялізнай работы далучыліся ўсёй грамадой. Дырэктар культурнай установы працавала без выхадных і нават у водпуску. А каб паспець адсвяткаваць раённыя Дажынкі ў аднаўленым будынку, апошні тыдзень у ім завіхаліся з венікам ды анучамі і работнікі райвыканкама.

Падчас восеньскіх суботнікаў тэрыторыю ўпрыгожылі туі, пасаджаныя работнікамі гаспадаркі. А рукамі ветэранаў сельскагаспадарчай галіны і пачэсных гасцей стварылі цэлую алею, якая ахінае Дом культуры.

Цяпер, спадзяюцца тут, ва ўстанову культуры будуць прыходзіць з яшчэ большай радасцю. Недахопу ж у людзях і іх цікавасці да мерапрыемстваў не было ніколі. «Людзі любяць глядзець на сваіх, на суседзяў, і бавіць час сумесна», — кажа дырэктар Дома культуры.

**Ірына СІДАРОК.**


• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | СУП «Гомельская СПМК-119» ОАО «Гомельоблстрой» г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а |

**Предмет аукциона**

| № Лота | Наименование | Начальная цена без НДС бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Механизм трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и гребенками, инв. № 70165 | 1 955,00 | 97,75 |
| 2 | Механизм трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и гребенками, инв. № 70164 | 1 955,00 | 97,75 |
| 3 | Механизм трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и гребенками, инв. № 70133 | 1 955,00 | 97,75 |
| 4 | Грузопассажирский фургон ГАЗ-2705 242, 2003 г. в., гос. рег. знак АЕ 9226-3 | 425,00 | 21,25 |
| 5 | Грузовой бортовой МАЗ 5336 А3 320, 2008 г. в., рег. знак АВ 8373-3 | 11 815,00 | 590,75 |
| 6 | Грузовой специальный, установка буровая ГАЗ-33081 ВКМ 317 01, 2008 г. в., рег. знак АВ 8165-3 | 12 750,00 | 637,50 |
| 7 | Экскаватор EW-1400, 2008 г. в., рег. знак ЕВ-3 1224 | 21 590,00 | 1 079,50 |
| 8 | Машина бурильно-крановая БМ-205Д, базовое шасси трактор колесный МТЗ-82.1, 2008 г. в., рег. знак. ЕВ-3 0796 | 21 845,00 | 1 092,25 |

**Местонахождение лотов:** г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Контактное лицо по осмотру: тел. +37529-670-83-18 (Громыко Юлия Ивановна), +37544-564-52-67 (Леонид Павлович Абакумов)

Лица, желающие принять участие в торгах обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 1 (одного) процента до 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона, в т. ч. о размере вознаграждения, размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в ЕГРСоБ 09.10.2019, в газете «Звязда» 10.10.2019

**Дата, время, место проведения аукциона: 08.01.2020** в 12.00, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Дата, время, место окончания приема заявлений на участие в аукционе: 04.01.2020** в 17.00, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |



**Открытое акционерное общество «Стройтрест № 4»**

сообщает, что 30 декабря 2019 года в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17.

**Повестка дня**

«О совершении сделки ОАО «Стройтрест № 4», в отношении которой имеется заинтересованность его аффилированного лица».

С материалами по вопросу повестки дня акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, 2-й этаж (кабинет 209) с 20.12.2019 по 30.12.2019 в рабочие дни с 9.00 до 17.00 с перерывом с 13.00 до 15.00, в день проведения собрания — с 9.00 до 14.30 по месту его проведения.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет проводится 30 декабря 2019 года с 15.00 до 15.45. Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 20 декабря 2019 года. Для регистрации на участие в собрании акционеру Общества необходимо иметь — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

Телефон для справок +375 17 334 33 64.

**Наблюдательный совет.**



**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: РУП «ИНКОС» БГУ (УНП 100037382), 220002, г. Минск, ул. Старовиленская, 54, в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Антикризисное управление», +375 (17) 348-37-29.

Публичные торги в форме аукциона будут проведены **20 января 2020 г. 09.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

**Предмет торгов** – грузопассажирский фургон Peugeot Partner, 2010 г. в., бордового цвета. Местонахождение предмета торгов – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода. Начальная цена – 5 138,75 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-04.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 21.12.2019 г. 09.00 по 17.01.2020 г. 16.00 подать заявление на участие в торгах по адресу г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, и перечислить задаток на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, а также аукционный сбор в размере 5 % от цены продажи, заключить договор купли-продажи, в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 19 снежня 2019 года.**